

ЦІ ПРЫЙДЗЕ ЛЕТНЯЕ ПАЦЯПЛЕННЕ

5

НЮАНСЫ ЖАНОЧАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 мая 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 99 (29468)

+TV праграма

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Беларусь прыхільная Мэтам устойлівага развіцця і прынцыпам зялёнай эканомікі, што пацвярджаецца ўзятымі міжнароднымі абавязацельствамі, а таксама шэрагам прынятых стратэгічных дакументаў. Задае магістральныя напрамкі тут Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2035 года. Яе мэтай з'яўляецца дасягненне інклюзіўнага ўстойлівага зялёнага росту ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства. Рэалізацыя асноўных задач стратэгіі дазволіць скараціць выкіды парніковых газаў да 38 % да 2035 года, а таксама павялічыць удзельную вагу паверхневых водных аб'ектаў з добрым і выдатным экалагічным статусам да 100 %».*

# Мы з Тайгою на граніцы



Фота БелТА

Пагранічнікі заставы «Кругавец-Калініна» ў Добрушскім раёне нясуць службу па ахове больш чым 15 кіламетраў беларуска-ўкраінскай граніцы. ***На здымку***: пагранічны нарад у складзе радавога Ягора ГЕЙДЭКА, інструктара службы сабак Паўла ІВАНОВА і службовага сабакі Тайгі падчас патрулявання граніцы.

## КОРАТКА

- **Фестываль-кірмаш народных мастакіх рамёстваў «Вясновы букет» пройдзе ў Мінску 29 мая.**
- У Беларусі ў 2020 годзе нарадзілі амаль тысяча жанчын, хто зацяжарыў дзякуючы ЭКА.
- **Чэмпіянат Еўропы па велатрэку ў Мінску адменены.**
- Другі Беларуска-Афрыканскі эканамічны форум пройдзе ў Мінску 31 мая і 1 чэрвеня.
- **Матч футбольных зорак у Мінску перанесены.**
- Нацплан па развіцці зялёнай эканомікі ў Беларусі вынесены на абмеркаванне.

ISSN 1990 — 763X

21099

Крок насустрач

## НЕАБХОДНАСЦЬ ЦІ РАСКОША?

### Адкрыць цэнтр падрыхтоўкі сабак-павадыроў усё ж магчыма

**Гісторый пра тое, як сабакі-павадыры выратоўваюць жыццё сваім падапечным, у інтэрнэце можна знайсці шмат. Адна з іх — пра Сесіла Уільямса, сляпога жыхара Нью-Ёрка. Накіроўваючыся да стаматолага, мужчына разам са сваім надзейным сябрам, сабакам-павадыром Арланда зайшоў у метро. і раптам адчуў, што перастае кантраляваць сваё цела.**

Сесіл страціў прытомнасць і зваліўся з платформы на рэйкі. Сабака ўчапіўся ў вопратку свайго сляпога гаспадара і паспрабаваў утрымаць яго ад падзення, а калі яно ўсё ж адбылося, скокнуў на рэйкі ўслед за ім. Машыністу саставу быў аддадзены загад неадкладна спыніцца, аднак тармазны шлях аказаўся больш доўгім, і два вагоны прайшлі над галовамі чалавека і сабакі. Але ўсё скончылася добра, Арланда застаўся цэлы, а яго гаспадар на кароткі час трапіў у бальніцу з невялікімі ранкамі на лбе.

Такіх гісторый пра сабак-герояў здаралася нямала ў розных краінах свету, але, на жаль, немагчыма знайсці гісторыю пра «беларускага Арланда». У нашай краіне няма арганізацый, якія выхоўвалі б такіх памочнікаў для невідушчых. Былі ініцыятывы, але яны не ўвасобіліся ў жыццё.



Яўген БЯЛІНСКІ, 27-гадовы студэнт з інваліднасцю па зроку, лічыць, што адкрыць цэнтр падрыхтоўкі сабак-павадыроў усё ж магчыма, калі скараціць выдаткі для ўтрымання такой арганізацыі і навучыць спецыяліста. І ён прыдумаў, як гэта зрабіць, а дапамагла ў гэтым яго сяброўка Ксенія Окрут, аспірантка і асістэнт-выкладчык у БДЭУ.

СТАР. 4

Радзімазнаўства. Адрасы пісьменства

*Сумесны праект Мінаблвыканкама і «Звязды»*

## ТАМ, ДЗЕ ПЛЕШЧАЦЦА НАРАЧ

Хто хоць аднойчы пабываў на Мядзельшчыне, вернецца сюды зноў і зноў. Гэта край блакітных азёр, чыстага паветра і сасновых бароў. Нездарма тут, вакол возера Нарач, раскінулася курортная зона плошчай каля 60 тысяч гектараў. Штогод у здраўніцах адпачывае больш як 100 тысяч чалавек. Ганарыцца Мядзельшчына і славутымі землякамі, якія праслаўлялі Нарачанскі край сваімі творамі. Сярод іх — паэты Максім Танк, Мар'ян Дукса, актрысы Марыя Захарэвіч і Паўліна Мядзёлка, спявак Уладзімір Каўрус, мастак Васіль Шаранговіч, харавы дырыжор Віктар Роўда, шмат якія грамадска-палітычныя дзеячы, вучоныя. У раёне восем творчых калектываў носяць званне «Узорны», тут ладзіцца рэспубліканскі фестываль харавога мастацтва «Пеўчае поле», фестываль «Камарова — кола дзён», на які з'язджаюцца народныя майстры і рамеснікі з усіх куткоў Беларусі.




На тэрыторыі раёна размешчана 170 помнікаў гісторыі, архітэктуры, археалогіі. Пяцьдзясят тры з іх уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. У 2016 годзе сюды ўнесены аб'ект нематэрыяльнай творчасці чалавека «Урачыстасць у гонар іконы Маці Божай Будслаўскай». Штогод у Нацыянальным санктуарыі Божай Маці ў Будславе праходзіць фэст у гонар іконы Маці Божай Будслаўскай, куды прыбывае па 10—20 тысяч паломнікаў.

У снежні 2014 года ў Мядзеле адкрыты помнік народнаму паэту Беларусі Максіму Танку.

СТАР. 20–21

З першых вуснаў

# «НАМ ТРЭБА ДУМАЦЬ ПРА БУДУЧЫНЮ БОЛЬШ СУР'ЁЗНА»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргеем Лебедзевым**

**Сустрэча прымеркавана да пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў краін СНД. Сёлета Беларусь старшынствуе ў Садружнасці, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, работы яшчэ шмат.**

### «Паставіць сур'ёзныя задачы і зрабіць прарыў»

«Нам трэба падумаць над тым, чым, з улікам вопыту, у рэшце рэшт, будзе займацца СНД, паставіць сабе больш сур'ёзныя задачы і, калі так можна сказаць, ажыццявіць нейкі прарыў у гэтай арганізацыі. Зразумела, што яна цяпер — нейкая дыскусійная пляцоўка ў асноўным, дзе мы абмяркоўваем важныя пытанні. Трэба, як мне здаецца, напоўніць нашу арганізацыю нейкай канкрэтыкай», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Ён прапанаваў адкрыта пагаварыць з кіраўнікамі дзяржаў, абмеркаваць, ці гатовыя яны рухацца ў напрамку іншых больш цесных аб'яднанняў, дапусцім, у эканоміцы ЕАЭС, ваенна-палітычнай сферы АДКБ.

«Калі б вы прапрацавалі гэтае пытанне і ўнеслі прапанову, я быў бы добрым лабістам нашага выканкама, каб прапанаваць кіраўнікам дзяржаў надаць больш дынамікі, большага аўтарытэту і вагі арганізацыі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### «Спакойнага жыцця нам ніхто не гарантуе»

Аляксандр Лукашэнка патлумачыў, чаму звярнуў увагу на гэтае пытанне. Па яго словах, падзеі апошніх дзён, тыдняў і месяцаў яскрава сведчаць пра тое, што трэба быць бліжэй.

«Я не хачу, каб падумалі некаторыя, што я спрабую краіны СНД падцягнуць да праблем Беларусі. Справа не ў гэтым. Нам трэба думаць пра будучыню больш сур'ёзна. А гэтыя інцыдэнты былі, ёсць і будуць. Спакойнага жыцця нам ніхто не гарантуе. А вось бліжэй быць, пакуль мы, цяперашняе пакаленне палітыкаў, размаўляем на адной мове, нам трэба. І сур'ёзна папрацаваць нам яшчэ трэба», — адзначыў беларускі лідар.

Саміт кіраўнікоў краін СНД плануецца правесці ў Мінску 15 кастрычніка гэтага года. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ўдзельнікі нядаўняга пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, якое праходзіла ў фармаце відэаканферэнцыі, абмяркоўвалі яго правядзенне. Па яго словах, планавалася, што спачатку пройдзе пасяджэнне кіраўнікоў ЕАЭС, дзе прэзідэнты абмяркуюць пэўныя пытанні, а пасля — сустрэча ў межах СНД.

«Словам, я гатовы да таго, каб сур'ёзна сустрэць тут кіраўнікоў дзяржаў у вочным рэжыме і прадставіць сур'ёзныя тэмы для размовы» — запэўніў Прэзідэнт.

### «Не толькі азірацца назад, але і глядзець наперад»

Сяргей Лебедзеў падкрэсліў, што сёлета Беларусь вельмі актыўна ўступіла ў сваё старшынства. Пад старшынствам нашай краіны правялі шэраг важных пасяджэнняў, і не толькі ў відэафармаце: пасяджэнне міністраў замежных спраў пад старшынствам міністра замежных спраў Беларусі ў Маскве, упершыню за год кіраўнікі ўрадаў сустрэнуцца ўжывую. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў дадаць актыўнасці.

«Мы пастаянна адчуваем увагу кіраўніцтва Беларусі, бачым, што і вы сочыце за ходам старшынства, за рэалізацыяй усіх запланаваных мерапрыемстваў. А іх запланавана вельмі шмат і на тэрыторыі Беларусі, і за яе межамі, і, што характэрна, пад старшынствам Беларусі. Сёлета 30 гадоў СНД. І тут вы маеце рацыю, што нам трэба не толькі азірнуцца назад на 30 гадоў, але і глядзець наперад, як ісці далей. Хачу адразу сказаць, што мы даўно ўжо працуем над тым, каб зрабіць дзейнасць СНД больш эфектыўнай. На гэта накіраваны нашы сумесныя дзеянні з ЕАЭС», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Каментарый у тэму

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Сяргей Лебедзеў падрабязна расказаў журналістам, аб чым ішла гаворка. Па яго словах, само жыццё падахвочвае да неабходнасці зрабіць Садружнасць больш эфектыўнай, пра што і казаў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня Выканаўчага камітэта СНД падкрэсліў, што палепшыць сітуацыю і ўзаемадзеянне можна і трэба за кошт актывізацыі эканамічнага супрацоўніцтва, актывізацыі гуманітарных сувязяў, сустрэч. «У гэтым годзе, калі Беларусь з'яўляецца старшынёй СНД, у яе ёсць магчымасць надаць новы імпульс нашаму ўзаемадзеянню. Як старшыня выканкама СНД, які бывае ў краінах Садружнасці і мае зносіны з кіраўніцтвам краін, я бачу, што такое жаданне ў народаў краін Садружнасці ёсць. Яшчэ захаваліся дружалюбныя адносіны, веданне культуры, літаратуры, мастацтва адно аднаго, жаданне падтрымліваць кантакты, ёсць жаданне актывізаваць турызм на прасторы СНД», — расказаў Сяргей Лебедзеў.

Асобна ён спыніўся на развіцці турызму на прасторы СНД, бо краінам Садружнасці, у тым ліку і Беларусі, ёсць што паказаць. «Беларусь прывяла ў добры стан многія гістарычныя помнікі, і тут шмат прыродных запаведнікаў, якія можна выкарыстоўваць для экалагічнага турызму. Лічбы сведчаць пра тое, што намаганні прыносяць свой плён. Адзінае, што нас тармозіць, — гэта пандэмія ковіду, якая спрыяла зніжэнню колькасці турыстаў, унесла велізарныя складанасці ў перамяшчэнне турыстаў не толькі ў СНД, — адзначыў Сяргей Лебедзеў. — Але мы будзем прыкладаць усе намаганні, каб не толькі захаваць наша супрацоўніцтва, але і развіваць яго, удасканальваць і павялічваць аб'ёмы ўзаемных сувязяў і, самае галоўнае, іх карыснасці адно для аднаго».

Сяргей Лебедзеў звярнуў увагу на тое, што Прэзідэнт Беларусі ўважліва сочыць за ходам старшынства краіны ў СНД і хоча, каб яно было эфектыўным. Па яго словах, беларускаму лідару гэта ўдаецца.

«Для Прэзідэнта важная падрыхтоўка да восеньскага пасяджэння кіраўнікоў дзяржаў, якое пройдзе 15 кастрычніка ў Мінску. Адміністрацыя Прэзідэнта, Міністэрства замежных спраў, выканкам СНД ужо прапрацоўваюць парадак дня сустрэчы. Мы вельмі спадзяёмся, што нічога не перашкодзіць асабіста сустрэцца Прэзідэнтам і шчыра пагаварыць аб праблемах СНД», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ З ДАКЛАДАМ ВІКТАРА ШЭЙМАНА

Кіраўнік спраў Прэзідэнта далажыў беларускаму лідару аб стане спраў у арганізацыях і прадпрыемствах Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Па выніках першага квартала бягучага года спрацавалі добра: у плюс выйшлі сельская гаспадарка, прамысловасць, будаўнічая галіна, лесаперапрацоўка. Было адзначана, што пазітыўныя зрухі ёсць і ў турыстычнай дзейнасці. Напрыклад, санаторый «Юнацтва» выйшаў на паказчыкі дакавіднага перыяду. І ў цэлым санаторыі сістэмы ўпраўлення справамі паказваюць нядрэнныя вынікі.

Адначасова былі разгледжаны перспектывы далейшай працы, новыя напрамкі, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

На сустрэчы таксама абмяркоўвалася супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. З улікам абставін і ўзмацнення ціску на Беларусь пастаўлена задача актыўнага выхаду на новыя напрамкі работы ў афрыканскім, лацінаамерыканскім і азіяцкім рэгіёнах.

Актуальна

# «НЕАБХОДНА З МАЛЕНСТВА ПРЫВІВАЦЬ ЛЮБОЎ ДА СВАЙГО НАРОДА»

**Менавіта так лічыць сенатар ад Гомельскай вобласці, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксей НЯВЕРАЎ.**



Парламентарый назваў падпісаныя апошнім часам кіраўніком дзяржавы законы вельмі своечасовымі.

«Вядома, у краіне, якая перажыла зверствы нацыстаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, прыняцце закона аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму можа здацца парадоксам, — мяркуе ён. — Але гэта рэаліі цяперашняга часу. Дапусціць прапаганду і ўсхваленне нацызму, разнастайных яго праяў з боку нашага пакалення было б злачынствам! На жаль, вопыт мінулага года паказаў, што былі спробы распальвання нянавісці паміж людзьмі. Каб папярэдзіць гэта, сёння неабходна ў кожнай сям'і з маленства дзецям прывіваць адвечныя каштоўнасці любові да сваёй Радзімы, свайго народа. Варта выхоўваць пачуццё патрыятызму, праслаўляць і шанаваць памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны, фарміраваць у маладога пакалення свяшчэнныя паняцці сумленнасці, прыстойнасці, мужнасці. І гэта не пафасныя словы, гэта тое, ад чаго будзе залежаць будучыня нашай краіны, тое, што зробіць яе яшчэ больш моцнай, шчаслівай, квітнеючай».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

АПК

# ЯК ПАСЕЕШ...

**На выставе «Белагра-2021» можна будзе ўбачыць айчынную тэхніку, якая працуе з ювелірнай дакладнасцю**



**На наступным тыдні на тэрыторыі Кітайска-Беларускага парка «Вялікі камень» з 1 да 5 чэрвеня пройдзе маштабная аграпрамысловая выстава «Белагра-2021», у якой, як правіла, прымаюць удзел больш за 30 краін свету. Але асноўныя экспаненты — беларускія прадпрыемствы. Чым яны здзівяць удзельнікаў і наведвальнікаў сёлета? Пра гэта мы распыталі распрацоўшчыкаў сельскагаспадарчай тэхнікі — прадстаўнікоў кампаніі «АМКАДОР», якая з'яўляецца лідарам па вытворчасці зернесушылак у нашай краіне. Акрамя таго, сёння кампанія ўваходзіць у ТОП-10 сусветных вытворцаў гэтага віду абсталявання. Усяго за чатыры гады «Амкадор-СЕМАШ» стаў таксама адным з асноўных вытворцаў абсталявання па апрацоўцы глебы.**

На выставе холдынг «Амкадор» прадставіць больш за 27 мадэляў машын і абсталявання для глебаапрацоўкі, перадпасяўной і пасляўборачнай апрацоўкі збожжа і яго захоўвання.

Як адзначыў **генеральны дырэктар ААТ «Амкадор-СЕМАШ» — кіруючая кампанія холдынга» Алег КОРСАК,** у цяперашні час імі выпрацоўваецца каля 60 найменняў сельскагаспадарчай тэхнікі і 180 яе мадыфікацый. Гэта пагрузачныя і разгрузачныя машыны, пагрузчыкі ўніверсальныя, тэлескапічныя і з бакавым паваротам. Таксама цяпер гэтае прадпрыемства выпускае машыны для апрацоўкі глебы, такія як шыроказахопныя глебаапрацоўчыя агрэгаты, культыватары, чызельныя плугі і іншыя. Вырабляюць тут машыны для ўнясення арганічных і мінеральных угнаенняў і машыны для карманарыхтоўкі і раздачы кармоў (касілкі, варушылкі).

Кампанія холдынга вырабляе і прычапныя машыны шматфункцыянальнага выкарыстання для пасляўборачнай апрацоўкі збожжа. У кагорту іх уваходзяць сушылкі, ачышчальныя машыны, цеплагенератары і іншыя віды абсталявання, якія неабходны для перапрацоўкі і захоўвання збожжа. Дарэчы, на выставе будуць паказаны самыя цікавыя ўзоры кампаніі.

Наколькі хутка змяняецца абсталяванне? Алег Корсак падкрэсліў, што XXI стагоддзе з'яўляецца часам высокіх тэхналогій. Таму аграрыі ўжо задумваюцца над тым, каб мець высакатэхналагічную тэхніку, з дапамогай якой зніжаюцца выдаткі на вытворчасць сваёй прадукцыі.

Спікер адзначыў, што ў асноўным тэхніка вырабляецца для ўнутранага спажывання, але яна паспяхова пастаўляецца ў краіны СНД і нават у рэгіёны далёкай дугі. Так, каля 30 % тэхналагічных агрэгатаў рэалізоўваецца на экспарт. Галоўныя заказчыкі гэтай тэхнікі — Расія, Украіна, Таджыкістан і Узбекістан. Тэхніка пастаўляецца і ў Аўстрыю, Літву, Польшчу.

Дастаткова актыўна кампанія трымае руку на пульсе па распрацоўцы новай тэхнікі. І гэта вельмі цікава, бо на прадпрыемстве прытрымліваюцца трэнду на дакладнае земляробства і лічбавізацыю ў сельскай гаспадарцы. Гэтаму ёсць прыклады: сеялка VERAS-12000, на якой усе сучасныя тэхналагічныя рашэнні ўжо выкарыстаны. Гэты ўзор зараз праходзіць тэставыя выпрабаванні. У яго з дапамогай GPS-сувязі ідзе злучэнне з агрэгатаваным машынным трактарам, а таксама арганізавана паралельнае кіраванне, якое дазваляе дасягаць добрай дакладнасці пасеваў, дзе адхіленне ад прамалінейнасці руху не можа быць больш чым 10—12 сантыметраў у маштабах вельмі аб'ёмнага поля. Дадзеная сеялка прызначана для сяўбы самых розных культур. Ёсць усе падставы гаварыць аб тым, што ў сучасным свеце гэта самы дасканалы пасяўны агрэгат, які адпавядае высокім стандартам, што прад'яўляюцца да сельскагаспадарчай тэхнікі такога прызначэння.

Для атрымання максімальнага ўраджаю для аграрыяў важна правесці сяўбу ў самыя аптымальныя тэрміны, калі ў глебе змяшчаецца досыць вільгаці і хуткае, раўнамернае ўнясенне насення забяспечвае іх добрую ўсходжасць. А гэта сеялка якраз і забяспечвае, акрамя высокай дакладнасці пасадкі, яшчэ і ўзорную прадукцыйнасць — больш за 12 гектараў за гадзіну.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Медыяпрастора

# ПРАЦАВАЦЬ НА РАЗВІЦЦЁ ГРАМАДСТВА

**У Мінску распачаўся I Форум медыйнай супольнасці Беларусі «СМІ ў эпоху лічбавізацыі». Дарэчы, у нас яшчэ не было мерапрыемства падобнага кшталту. На пляцоўцы «БелЭкспа» сабраліся прадстаўнікі рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі, медыяэксперты, каб абмеркаваць найбольш актуальныя пытанні развіцця айчынных медыя, ролю і месца дзяржаўных СМІ ў інфармацыйнай бяспецы краіны.**



На пачатку сустрэчы **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ** зачытаў прывітанне ад Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам, гасцям і арганізатарам форуму. Ігар Луцкі выказаў думку, што вельмі многае цяпер залежыць ад таго, як апаратыўна, дакладна, пэўна журналісты будуць расказваць сваёй аўдыторыі пра тое, што адбываецца ў краіне і свеце. «Лічу, што нам нельга ні на секунду расслабляцца. Журналіст моцны словам, моцны пяром. І надышоў час пагаварыць пра тое, што адбываецца ў медыйным полі краіны. Пра тое, як нам сумеснымі намаганнямі не толькі тут, у Мінску, але і ў рэгіёнах кансалідавана адстойваць пазіцыю дзяржавы, пазіцыю краіны, пазіцыю суверэнітэту. Гэта нельга браць пад сумненне. Вельмі важна сёння ўсім згуртавацца і быць адзінымі».



Журналістыка павінна працаваць на развіццё грамадства і дзяржавы, звярнуў увагу падчас пленарнага пасяджэння форуму **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

— Сучасныя сродкі масавай камунікацыі аказваюць вызначальны ўплыў на фарміраванне каштоўнасных маральных установак, настрой грамадства, асобных людзей, сацыяльных груп і адносіны да тых ці іншых падзей. У гэтых умовах як ніколі значная роля сумленнай, адказнай журналістыкі, якая эфектыўна супрацьстаіць спробам пасеяць варожасць, раскалоць грамадства. Глабальная лічбавізацыя нясе як новыя магчымасці, так і новыя пагрозы. Сродкі масавай інфармацыі здольныя як узбагаціць чалавека ведамі, так і дэзынфармаваць, пасеяць недавер і страх. Ад таго, якую пазіцыю зоймуць СМІ, шмат у чым будзе залежаць будучыня грамадства і нашай дзяржавы. У апошнія гады мы сталі сведкамі цэлага шэрагу палітычных узрушэнняў, узброеных канфліктаў, нават поўнамаштабных войнаў, у тым ліку інфармацыйных. Адметнай асаблівасцю ўсіх гэтых падзей стала велізарная роля сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі. Каб адказваць на выклікі, быць канкурэнтаздольнымі, СМІ неабходна працаваць з выкарыстаннем прагрэсіўных тэхналогій, аўтаматызацыяй, крос-медыйнасцю, прымяненнем новых методык аналізу інфармацыйных плыняў, трэндаў. З іншага боку, за асвятленнем камунікацыйных платформаў, пагоняй за кароткасцю, тэхналагічнасцю нельга губляць і журналістыку як мастацтва працы са словам.




На форуме можна было пачуць розныя меркаванні ад экспертаў, прафесіяналаў у сферы медыя. **Генеральны дырэктар радыёстанцыі «Гаворыць Масква» Уладзімір МАМАНТАЎ** перакананы, што СМІ павінны быць аб'ектыўнымі і чуць, што аўдыторыя хоча ведаць. «Парадак дня сёння мяняецца вельмі хутка. Журналістам трэба даваць адказы на любыя запыты свайго чытача, гледача, слухача. Нам, дарэчы, падаюць добры прыклад нашы кіраўнікі — выходзяць і распавядаюць, як яны бачаць тую ці іншую сітуацыю».

**Старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ** таксама пацвердзіў, што трансфармацыя медыяполя за апошні час дастаткова відавочная, ёсць пэўныя выклікі, але наша медыясупольнасць з імі спраўляецца.

Ад чаго залежаць трэнды на найбліжэйшыя некалькі гадоў — аб гэтым на форуме расказала **намеснік галоўнага рэдактара міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня» Наталля ЛОСЕВА.** «У трэндах сёння гук — карыстальнікі аддаюць перавагу праслухоўванню, а не чытанню. А мы ўмеем рабіць для іх кантэнт? Прыйдзецца навучыцца. Роля СМІ як вытворцы якаснага кантэнту і інстытута, які ўмее фільтраваць гісторыю з хаосу, будзе расці. Але важна разумець, у якім фармаце карыстальнікі будуць спажываць наш прадукт».

**Галоўны рэдактар інфармацыйнага агенцтва «Мінская праўда» Ларыса КОРШУН** на пытанне «Ці выжывуць газеты ў эпоху інтэрнэту?» адказала ўпэўнена: «Разам з высокімі тэхналогіямі ўжо дзясяткі гадоў існуюць друкаваныя сродкі масавай інфармацыі. Яны заўсёды публікуюць правераную інфармацыю, а не закідваюць чытача фэйкамі. Прыемна, што сёння дзяржаўныя СМІ не баяцца абмяркоўваць вострыя тэмы. Цяпер мы паказваем і расказваем аб усім, толькі пад пэўным ракурсам, даючы сваю ацэнку рэчаіснасці. У гэтым плане журналістыка зрабіла вялікі крок наперад».

Па выніках першага дня форуму была прынята рэзалюцыя, у якой, у прыватнасці, гаворыцца: «Мы адзначаем неабходнасць кансалідацыі прафесійнай журналісцкай супольнасці з мэтай эфектыўнага процідзеяння новым выклікам і пагрозам, забеспячэнню інфармацыйнай бяспекі суверэннай Беларусі і справядлівага парадку, павышэння якасці жыцця нашага народа. І тут наша задача — несці праўду, супрацьстаяць масіраваным нападам апанентаў, не дазваляць ім спекуляваць свядомасцю народа і фарміраваць няправільнае ўспрыманне падзей, якія адбываюцца, не дапускаць расколу ў беларускім грамадстве».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

---

Блізкая ўлада

## Апошні майскі званок

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 29 мая, з 9.00 да 12.00, правядуць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЯНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

---

Надвор'е

## У ВЫХАДНЫЯ — МОЦНЫ ПАРЫВІСТЫ ВЕЦЕР І ЗНОЎ ДАЖДЖЫ

**А ў першы летні дзень — тэмпературны фон будзе на 2—4 градусы ніжэйшы за кліматычную норму**

**Апошнія дні мая паказваюць, што гэты месяц стане сапраўды халадным. Для нашай краіны гэта не рэдкасць, бо апошнім часам, прыкладна раз на тры гады, менавіта май становіцца халаднейшы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ужо сёння вялікая частка Беларусі трапіць пад уплыў няўстойлівай паветранай масы. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, а па паўднёвым усходзе краіны — месцамі моцныя. Максімальная тэмпература паветра складзе 17—23 градусы са знакам плюс.

У суботу стане халадней. Тэмпература ўначы будзе вагацца ад плюс 6 градусаў па захадзе да 14 цяпла па ўсходзе краіны, удзень чакаецца плюс 14—19 градусаў, месцамі да 21 цяпла. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер паўночна-заходні, паўночны ўмераны, удзень парывісты.

Не зусім зразумелае надвор'е чакаецца і ў нядзелю. У многіх рэгіёнах краіны захаваецца ўплыў маларухомага атмасфернага фронту. Чакаецца воблачнасць з праясненнямі. На большай частцы нашай тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Вецер паўночнай чвэрці парывісты, удзень месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 5 да 12 градусаў са знакам плюс, у паўднёва-ўсходніх раёнах — да 14 цяпла, удзень — 13—20 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак на большай частцы тэрыторыі надвор'е будзе вызначаць маларухомая франтальная сістэма і халодная паветраная маса. Чакаецца воблачнасць з праясненнямі. Уначы па паўднёва-ўсходняй палове, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер усходні, паўночна-ўсходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы — 5—12 цяпла, а ўдзень — усяго толькі ад 9 да 16 цяпла. Дарэчы, першы летні дзень (аўторак — 1 чэрвеня) не прынясе нам шмат радасці. Зноў неба накрые шэрасць, а зверху пальецца кароткачасовы дождж. Удзень месцамі магчымы навальніцы. Вецер усходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—11 цяпла, удзень будзе па-ранейшаму не горача —12—19 цяпла. Не, няпраўда, не лета гэта, пакуль не яно...

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### FT: багацце расійскіх мільярдэраў перавысіла трэць ВУП краіны



Расія апынулася на першым месцы ў свеце па багацці сваіх мільярдэраў адносна ВУП краіны.

На долю найбагацейшых людзей Расіі прыпадае каля 35 % ад унутранага валавога прадукту, гаворыцца ў калонцы аналітыка амерыканскай кансалтынгавай кампаніі Morgan Stanley Ручыра Шармы для Financial Times.

Шарма склаў рэйтынг на аснове спіса мільярдэраў Forbes пра багацце мільярдэраў па краіне паходжання і ацэнках памеру ВУП краіны паводле даных Міжнароднага валютнага фонду. Другое месца займае Швецыя (багацце мільярдэраў складае 30 % ад ВУП краіны), на трэцім — Індыя (20 % ад ВУП). У пяцёрку таксама ўвайшлі ЗША і Францыя (19 % і 17 % адпаведна).

### У Каліфорніі супрацоўнік чыгуначнай станцыі расстраляў восем чалавек

Восем чалавек загінулі ў выніку стралянiны ў амерыканскім горадзе Сан-Хасэ (штат Каліфорнія), паведамляе Reuters.

Інцыдэнт адбыўся на чыгуначнай станцыі. Стральбу зладзіў супрацоўнік станцыі, ахвярамі сталі яго калегі. Калі паліцэйскія прыбылі на месца здарэння, стралок застрэліўся. Паведамляецца, што на станцыі паліцыя таксама выявіла выбуховае прыстасаванне.

Матывы нападаючага пакуль невядомыя.

### Амерыканскі горад пачаў сыходзіць пад зямлю




Невялікі фермерскі горад Каркаран пачаў сыходзіць пад зямлю. Змены практычна нябачныя для мясцовых жыхароў ці гасцей гарадка, аднак іх добра можна адсачыць па спадарожнікавых здымках NASA, паведамляе выданне The New York Times.

За апошнія 14 гадоў горад у некаторых месцах апусціўся на 11,5 фута (каля 3,5 м), што роўна прыкладна аднаму паверху жылога дома. На думку вучоных, прычынай таго, што адбылося, стала актыўнае вядзенне сельскай гаспадаркі. Фермеры выпампоўваюць вялікую колькасць грунтавых вод для арашэння сваіх палёў, у выніку чаго глеба пачынае правальвацца.

Штогод горад Каркаран з насельніцтвам амаль 22 тысячы чалавек павольна апускаецца пад зямлю, глеба прасядае ў асобных месцах ад некалькіх сантыметраў да 0,6 м. На думку экспертаў, такая з'ява не нясе драматычных наступстваў для жыхароў Каркарана, аднак яе ўплыў на тапаграфію горада ўсё ж істотны. Адзначаецца, што ні дамы, ні будынкі, ні дарогі ў горадзе пакуль не разбурацца. Але сітуацыя можа ў любы момант змяніцца кардынальна.

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ!

# РАТАВАЛЬНІКАМ ЛЮБАЯ ЗАДАЧА ПАД СІЛУ

## Міністэрства па надзвычайных сітуацыях правяло вучэнне на ўнікальным прамысловым аб'екце




**На адным з заводаў у Пухавіцкім раёне грузавы аўтамабіль сутыкнуўся з цыстэрнай, якая перавозіць аміяк. Пад аўтамабілямі апынуліся два работнікі прадпрыемства...**

На месца здарэння тэрмінова прыбылі супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Налажыўшы бандаж на пашкоджаную цыстэрну, ратавальнікі-хімікі ўстанавілі вадзяныя заслоны з мэтай папярэджання распаўсюджвання небяспечных пароў аміяку. Пацярпелых дэблакіравалі з дапамогай гідраўлічнага і пнеўматычнага абсталявання, на квадрацыкле транспартавалі да месца аказання першай медыцынскай дапамогі...

На шчасце, гэта не зводка надзвычайнага здарэння, а ўмоўная сітуацыя, якую падчас планавага вучэння на Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі адпрацоўвалі падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Па задумцы другога этапу вучэння, гарэў склад гатовай прадукцыі — камбікорму. Вада на прадпрыемстве адсутнічала: не завершаны будаўнічыя работы на аб'екце. З гэтай прычыны да месца надзвычайнага здарэння ваду даставіў пажарны аварыйна-выратавальны цягнік, які здольны перавозіць больш чым 100 тон вогнетушыльнага рэчыва. Акрамя таго, у ліквідацыі ўзгарання быў задзейнічаны верталёт авіяцыі МНС, які можа транспартаваць пяцітонную ёмістасць з вадой. Сітуацыя ўскладнялася тым, што склад, які «гарэў», шчыльна прыстаўлены да будынка вышынёй у 30 метраў. Персанал эвакуіравалі, аднак двое супрацоўнікаў з-за моцнага дыму аказаліся на даху завода. Альпіністы-ратавальнікі дапамаглі ім спусціцца з дапамогай спецыяльнага альпінісцкага абмундзіравання. У выніку пажар быў патушаны, пацярпелым аказана медыцынская дапамога.



— Умовы вытворчасці на прадпрыемстве з'яўляюцца хімічна небяспечнымі, невыпадкова ратавальнікам былі пастаўлены наступныя задачы: ліквідаваць аварыю на хімічным аб'екце, а таксама патушыць умоўны пажар, — адзначыў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ЛАПАНОВІЧ.** — У вучэнні былі задзейнічаны 19 адзінак аварыйна-выратавальнай тэхнікі, 77 чалавек асабовага складу, а таксама авіяцыя МНС і пажарны аварыйна-выратавальны цягнік Беларускай чыгункі. Мы ўлічылі, што з прычыны таго, што прадпрыемства знаходзіцца на стадыі будаўніцтва, існуюць праблемы з водазабеспячэннем. У тым ліку мы адпрацоўвалі аб'ект як новабудоўлю. Цяжкасці ўзнікаюць пры эвакуацыі людзей з высокіх будынкаў: падчас вучэння была задзейнічана тэхніка, прызначаная для выратавання людзей, якія знаходзяцца на вышыні.





У вучэнні бралі ўдзел падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях: Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння, пажарна-аварыйны атрад Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, авіяцыя МНС і пажарны аварыйна-выратавальны цягнік Беларускай чыгункі.

**Кіраўнік праекта будаўніцтва Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі Юрый ШЫЛЯГІН** даў вучэнню высокую ацэнку. «Мы таксама былі зацікаўлены ў яго правядзенні, разумеючы, што наша вытворчасць патэнцыйна небяспечная, бо звязана з выкарыстаннем вялікай колькасці атрутных рэчываў, акрамя таго, прадпрыемства з'яўляецца выбуховапажаранебяспечным, — расказаў прадстаўнік карпарацыі. — З мэтай прадухілення надзвычайнай сітуацыі на прадпрыемстве створаны аддзел прамысловай бяспекі, распрацоўваецца ўся неабходная дакументацыя. Мы разумеем і сваю зону адказнасці ў пытанні бяспекі. Увогуле, прадпрыемства запраектавана такім чынам, каб выключыць магчымасць надзвычайнай сітуацыі, аднак заўсёды трэба быць гатовымі да яе ліквідацыі».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота дадзена Мінскім абласным упраўленнем МНС.**

# НЕАБХОДНАСЦЬ ЦІ РАСКОША?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам яны вывучылі міжнародны вопыт функцыянавання падобных арганізацый у Расіі, Эстоніі, Вялікабрытаніі, Германіі, Японіі, Польшчы, Украіне і ЗША, знайші і сфармулявалі ключавую праблему, якая перашкаджала рэалізаваць падобныя ідэі ў нашай краіне, а потым склалі бюджэтны праект і падалі заяўку на конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend (SW). У рамках гэтага конкурсу з усёй краіны збіраюць сацыяльна арыентаваныя ідэі. Аўтары ініцыятыў падчас правядзення конкурсу больш дасканала вывучаюць праблему і імкнуцца выпрацаваць рашэнне для самастойнага функцыянавання арганізацыі, якую яны прапануюць зрабіць. Па выніках конкурсу найбольш прапрацаваныя праекты атрымліваюць фінансавую падтрымку з боку буйных беларускіх кампаній і партнёраў конкурсу. Ініцыятыва Яўгена і Ксеніі ўжо ў паўфінале Social Weekend і працягвае барацьбу ў конкурсе сацыяльнага прадпрымальніцтва. Ці вялікі шанцы ў гэтай ініцыятывы на конкурсе і чаму гэта так важна, расказаў сам аўтар праекта.

— Ужо была спроба адкрыць школу падрыхтоўкі сабак-павадыроў, але яна так і засталася нерэалізаванай, — расказвае Яўген. — Пры падрыхтоўцы нашага праекта мы пазнаёміліся з дзяўчатамі, якія працавалі над гэтым раней, і высветлілі адну з найважнейшых праблем: у Беларусі няма спецыяльных кінолагаў, якія мелі б веды і права рыхтаваць такіх сабак. Але калісьці ж яны павінны з'явіцца! Навучанне кінолаг можа прайсці ў Маскве, і мы такі варыянт прадугледзелі. Наша грамадства рухаецца да інклюзіі (працэс рэальнага ўключэння людзей з інваліднасцю ў актыўнае грамадскае жыццё), і адкрыццё такой школы будзе яшчэ адным крокам да гэтага. Назапашаны папярэднімі праектамі вопыт няўдач, наша напорыстасць і крыху шанцавання могуць даць вынік. Прынамсі, нам сапраўды па сілах у выніку ўдзелу ў конкурсе забяспечыць навучанне аднаго кінолага, купіць два-тры першыя шчанюкі, якія будуць жыць у валанцёраў, і клапаціцца пра іх да моманту перадачы ўладальніку. Задача гэтая выглядае цалкам пасільнай.

***— У вас ужо ёсць людзі, гатовыя ўтрымліваць жывёл?***

— Так, у Беларусі вельмі развіты валанцёрскія і ўзаемадапаможныя настроі, таму з валанцёрамі звычайна праблем не ўзнікае, асабліва калі гэта датычыцца магчымасці пажыць з маленькім сабачкам. Паралельна з тым, як кінолаг будзе праходзіць навучанне ў Маскве, неабходна купіць трох падыходзячых для работы і пратэставаных шчанюкоў, якія будуць праходзіць базавую падрыхтоўку са звычайным кінолагам па меншай меры да 12-месячнага ўзросту. Далей, калі «вучань» вяртаецца з Масквы, пачынаецца спецыяльная падрыхтоўка сабакі і работа з будучым гаспадаром. Такім чынам, калі ў нас усё складзецца, то беларусы змогуць атрымаць першых сабак-павадыроў праз 15 месяцаў.



***— Чаму так важна, каб школа па падрыхтоўцы сабак усё ж з'явілася ў Беларусі?***

— У мяне ў самога даволі сур'ёзныя праблемы са зрокам, і больш за 20 гадоў, ад канца 90-х, я ў ролі пацыента перыядычна праходжу дыягностыку ці лячэнне ў розных афтальмалогіях Беларусі і не толькі — быў з медыцынскімі «вакацыямі» ў Маскве, Самары ды нават у Ізраілі... Некалькі гадоў я навучаўся ў Гродзенскай спецыяльнай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку. Але ў дзяцінстве, сутыкаючыся з асаблівасцямі жыцця такіх людзей, не звяртаў на іх увагі. Да таго ж і мой зрок быў значна лепшы ў тыя часы. Аднак пазней я пачаў больш пільна ставіцца да тых, з кім аказваюся ў адных бальнічных палатах ці ў чэргах да ўрача. Так я даведаўся аб праблеме адсутнасці сабак-павадыроў, пра тое, што ў Беларусі ніколі не было ўласных школ па іх падрыхтоўцы, што толькі адзінкі з сотняў невідушчых могуць дазволіць сабе набыць такога сабаку з Масквы, які будзе каштаваць дзясяткі тысяч долараў. Захацелася неяк пакруціць гэтую праблематыку, вывучыць ды падумаць, што можна было б зрабіць.

***— У прэзентацыі свайго праекта вы сцвярджаеце, што, нягледзячы на развіццё лічбавых тэхналогій, сабака-павадыр — адзін з найбольш эфектыўных асістэнтаў, якія могуць дапамагаць сляпому пры перамяшчэнні па-за межамі дома...***

— Давайце возьмем у якасці прыкладу невідушчага чалавека. На самай справе, у яго ёсць тры больш-менш добрыя каналы атрымання дапамогі. Па-першае, чалавек. Ніякія тэхналогіі ці нават сабака не змогуць замяніць чалавека. Нельга замяніць ні блізкага чалавека, ні прафесійнага памочніка, ні выпадковага сустрэчнага, і пра гэта ўсім варта памятаць, бо ніякае зручнае асяроддзе, пра якое шмат кажуць, нікому не дапаможа, калі побач будуць не гатовыя да асістэнцтва суграмадзяне. І гэта таксама сур'ёзная праблема. Некалі ў Расіі мяне ўразіў выпадак у афтальмалагічнай клініцы. Я, пацыент, заблытаўся ў кабінетах і спытаў у першым з іх, куды тут ісці, а ў адказ пачуў: «На дзвярах напісана!». І такое адбываецца, на жаль, і ў нас: бывае, спытаеш нумар тралейбуса, а табе адкажуць: «А вы што, не бачыце? Чалавек — на першым месцы, але немагчыма і непатрэбна, каб наш невідушчы ўсюды хадзіў пад руку з асістэнтамі.

Па-другое, сабака і тэхналагічныя прылады. Я паставіў бы іх на адзін узровень па вартасці для чалавека з праблемамі. І галоўнае не ў тым, каб сабакі канкурыравалі са спецыяльнымі мабільнікамі ці навігатарамі, але яны могуць дапаўняць іх. У дзяржаве на сёння існуюць праграмы фінансавання так званых сродкаў тэхнічнай дапамогі людзям з інваліднасцю, і набываецца шмат карысных рэчаў для ўсіх тых, каму яны патрэбны. Але, на жаль, ніякі смартфон, нават самы спецыялізаваны, не можа пільна і дакладна абводзіць нашага невідушчага вакол узніклых ям, луж, машын, дзяцей, якія сталі пасярод дарогі, лавак, сумак, якія хтосьці паставіў каля пад'езда... Сабака бачыць, аналізуе і прымае хуткія рашэнні, каб не марнаваць час і не ставіць гаспадара ў больш залежнае ад усіх навакольных людзей становішча. Падрыхтаваны сабака дазваляе чалавеку даверыцца ў сітуацыях «тут і зараз», адчуўшы, што ёсць нехта, хто можа дапамагчы вырашыць праблему. Паверце, гэта вельмі важна ў апісаных сітуацыях. Не кажучы ўжо пра эмацыянальную падтрымку і любоў сабакі да гаспадара, нягледзячы ні на што.

***— Сёння людзі з праблемамі зроку спраўляюцца неяк без сабак-павадыроў. Вы ж гаворыце, што такі сабака паспрыяе павышэнню ўзроўню сацыяльнай і эканамічнай ўцягнутасці невідушчых краіны.***

— Сабака не ўсёмагутны, і для таго, каб па-сапраўднаму павялічыць узровень сацыялізацыі ці нават эканамічнага саўдзельніцтва ў грамадстве людзей з інваліднасцю, патрэбна мноства захадаў. І хаця ў Беларусі людзі з сабакамі маюць права заходзіць у грамадскі транспарт ці некаторыя магазіны і ўстановы, гэтыя магчымасці трэба пашыраць. Напрыклад, у той жа Расіі, у Магнітагорскім універсітэце, існуюць спецыяльныя памяшканні, дзе невідушчы студэнт можа пакінуць свайго сабаку падчас заняткаў, адвучыцца і спакойна пайсці далей па справах. І гэта вельмі добры падыход...

Самае галоўнае — невідушчы чалавек з сабакам атрымлівае шанц на самастойныя прагулкі ў любое надвор'е і час сутак, не баючыся стаць залежным, заблукаць ці спатыкнуцца. Гэта зусім іншы ўзровень камфорту, якога дастойны нашы суайчыннікі, якія маюць у гэтым патрэбу.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Прырода

# У НАЙБЛІЖЭЙШЫЯ 20 ГАДОЎ СПЯКОТЫ НЕ ПРАГНАЗУЕЦЦА

## А вось ападкаў у чэрвені чакаецца значна больш за норму

**Набліжаецца лета, а мы яшчэ нават не адчулі па-сапраўднаму цёплага вясновага надвор'я, нягледзячы на шматлікія размовы аб глабальным пацяпленні. Гэта так, але, на думку дырэктара Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Сяргея ЛЫСЕНКІ, самая вялікая памылка — гэта меркаваць аб змяненні клімату па тым надвор'і, якое стаіць за акном. У ацэнках змены клімату ён раіць лепш спадзявацца не на жыццёвы вопыт, а на разліку вопытных спецыялістаў.**

Прафесар заўважыў, што ў апошнія 40—50 гадоў назіраецца беспрэцэдэнтнае працяглае пацяпленне, і гэта бясспрэчны факт. Ніколі яшчэ ў вядомай нам гісторыі Зямлі — а мы маем палеакліматычныя даныя больш чым за 8 тысяч гадоў — сярэдняя тэмпература нашай планеты не расла з такой велізарнай хуткасцю, як у нашы дні. Не выключаюць асаблівых спрэчак і прычыны гэтага пацяплення. Большасць навукоўцаў сыходзяцца ў меркаванні, што яно з'яўляецца вынікам павелічэння ўтрымання вуглякіслага газу ў атмасферы. Прычынай апошняга стала актыўная дзейнасць чалавека.



### Самы цёплы год

Змяненне клімату — рэальнасць і агульнасусветная праблема. Актуальная яна і для Беларусі. Як адзначае **першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана КУЗЬМІЧ,** за ўсю гісторыю інструментальных назіранняў — а вядуцца яны з 1881 года — перыяды пацяплення рэгулярна чаргаваліся з перыядамі пахаладання. Аднак сучаснае змяненне клімату пачалося ў 1989 годзе рэзкім павышэннем тэмпературы паветра і працягваецца па цяперашні час.

— За перыяд з 1990-х гадоў сярэднегадавая тэмпература паветра на тэрыторыі Беларусі павысілася ў сярэднім на 1,3 градуса, — удакладняе спецыяліст. — Прычым тэмпературная анамалія распаўсюджваецца нераўнамерна: найменшыя адхіленні зафіксаваны на станцыях у Клічаве і Лельчыцах, найбольшыя — да паўтара градуса — у Віцебску і Пінску.

Згодна з маніторынгам змяненняў кліматычных параметраў, які вядзе Белгідрамет, 2020-ы з сярэднегадавой тэмпературай 9,1 градуса цяпла стаў самым цёплым годам на тэрыторыі Беларусі за ўсю гісторыю метэаназіранняў. Да гэтага максімальны па цеплыні быў 2019 год, калі было зафіксавана плюс 8,8 градуса.

Сярэдняя хуткасць росту сярэднегадавой тэмпературы на тэрыторыі нашай краіны складае 0,4 градуса за 10 гадоў, што перавышае сярэдняе значэнне па зямным шары, якое ацэньваецца ў 0,1—0,3 градуса.

У апошнія гады тэмпература ў нас вышэйшая за норму кожны месяц, акрамя мая (тут стабільная норма). А акрамя змяненняў тэмпературнага фону, стала больш засушлівых перыядаў (у цэлым ужо трэці год запар адзначаецца недабор сярэднегадавых сум ападкаў) і менш дзён з устойлівым снежным покрывам (зімой 2019—2020 года снежнага покрыва практычна не было). Для тэрыторыі нашай краіны зараз характэрна памяншэнне працягласці зімы на 5—8 дзён і павелічэнне працягласці лета на 3—7 дзён. Адзін з аспектаў змены клімату — павелічэнне экстрэмальных метэаралагічных з'яў. Так, за 18 дзён мая ў гэтым годзе выпала 173 % месячнай нормы ападкаў.

### Летняе пацяпленне замарудзілася

На фоне ўстойлівага пацяплення, выкліканага антрапагенный дзейнасцю чалавека, у асобных рэгіёнах зямнога шара адбываюцца квазіцыклічныя ваганні кліматычных характарыстык рознай перыядычнасці. Як адзначае Сяргей Лысенка, у рэгіёне Усходняй Еўропы найбольш значным з'яўляецца 60-гадовы натуральны цыкл. На гэты цыкл, пачынаючы з другой паловы 70-х гадоў мінулага стагоддзя, выпала прыкладна чвэрць летняга пацяплення. Бягучая фаза цыкла будзе падобнай да той, што назіралася ў 1940—1970 гады. Таму ў найбліжэйшыя два дзесяцігоддзі можна чакаць павелічэнне колькасці летніх ападкаў і запаволенне гадавога пацяплення. Сапраўды, непасрэдна з 2011 года летняе пацяпленне ўжо замарудзілася прыкладна ў два разы. Летняе «згладжванне» пацяплення, на думку спецыяліста, з'яўляецца станоўчым фактарам для развіцця сельскай гаспадаркі і вядзення лясной гаспадаркі.

«Апісаць найбліжэйшае лета агулам сёння не ўяўляецца магчымым, — падкрэсліў эксперт. — У сусветнай практыцы зіма 2019—2020 гадоў называлася «зімой стагоддзя», а яе фактычна не было ў Беларусі». Таму ў доўгатэрміновых прагнозах нашы спецыялісты даваяраюць статыстычным метадам. Згодна з гэтымі айчыннымі распрацоўкамі, атрымліваецца, што ў чэрвені тэмпература паветра будзе толькі ледзь-ледзь вышэйшая за сярэднестатыстычныя паказчыкі гэтага месяца.

«Па розных мадэлях сярэдняя тэмпература паветра ў чэрвені прагназуецца ад 16,2 градуса да 16,8 градуса са знакам плюс. Гэта значыць, нашы паказчыкі ўшчыльную блізкія да кліматычнай нормы», — падкрэсліў прафесар. Ападкаў выпадзе больш за норму. Што датычыцца другога і трэцяга месяцаў лета, то прагнозы інстытутам будуць распрацаваны трохі пазней.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Гайненский сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 28 июня 2021 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Корень, ул. Северная, У-13А, кадастровый номер 623280805101000161, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1500 | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение | 7000,00 | 1400,00 | 2274,47 + расходы за размещение объявления |
| 2 | аг. Гайна, ул. Озерная, д. 10А, кадастровый номер 623280801601000282, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,2500 | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение | 11900,00 | 2380,00 | 193,85 + расходы за размещение объявления |
| 3 | д. Кузевичи, ул. Садовая, 6, кадастровый номер 623284502101000059, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,2343 | Водоснабжение | 7500,00 | 1500,00 | Расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 28.06. 2021 в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Логоза, ул. Центральная, д. 2, Гайненский сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 53927, 53957, 53938; (+37529) 1283467.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 22.06.2021 включительно.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY60AKBB36006190211080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X г. Минск, код 795, ОКПО 04431493,УНН 600537220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Першую летнюю раніцу гледачы сустрэнуць у кампаніі малодшых брата і сястры вядучых шоу «Уключайся!» Машы Хрусталёвай і Данілы Жданько — 16-гадовы Ваня і 12-гадовая Соня плануюць правесці першы самастойны эфір на «двойцы» па-свойму. Яны распавядуць пра дзіцячае «прафесійнае» свята, а таксама абмяркуюць хвалюючыя падлеткаў тэмы, павучацца ў валанцёраў правільна дапамагаць жывёлам, сустрэнуцца з вядомым Тік-Ток-блогерам, каб даведацца пра апошнія трэнды, а пасля паглядзяць любімыя мультфільмы. Разам з шэф-кухарам праекта Вольгай Падалянчык і яе сынам юныя вядучыя згатуюць снядане па новым рэцэпце. У такой кампаніі ніхто не засумуе!

А вось для праекта «ПІН_КОД» гэты дзень таксама стане знакавым, бо ў эфір выйдзе 1111-ты выпуск праграмы. З гэтай нагоды правядуць свой першы эфір фіналісты рэаліці-кастынгу, пераможца якога ў хуткім часе стане новым вядучым тэлепраекта. Ключавой тэмай спецвыпуска «ПІН_КОДа» стане летні адпачынак. Традыцыйна не абыдзецца без розыгрышу прызоў і размоў з гледачамі ў рэжыме рэальнага часу. А вось тэлевізійны інфармацыйны блок «Нічога сабе ньюз» у гэты дзень будзе прысвечаны выключна дзіцячым навінам. Святкуйце ў цікавай кампаніі!

**Алена ДРАПКО.**

Песню бярыце з сабою...



Рубрыку вядзе кампазітар
**Яўген КСЯНЕВІЧ.**
evgenyksenevich@gmail.com

# ЗВАНЫ

**Анатоль Сыс (1959—2005) — вядомы беларускі паэт. Актыўная творчая дзейнасць аўтара ў канцы XX стагоддзя аказала вялікі ўплыў на тагачаснае пакаленне беларускіх паэтаў. Аўтар прыжыццёвых паэтычных зборнікаў «Агмень», «Пан Лес», «Сыс», пасля заўчаснай смерці надрукаваны зборы твораў «Лён», «Alaiza», «Берагі майго юнацтва».**
**Апошняя кніга «Званы» выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда» ў лістападзе 2020 года.**
**Пасля дабрачыннага канцэрта ў 2007 годзе ў мінскім касцёле святых Сымона і Алены ўсе сабраныя грошы былі перададзены на помнік паэту.**
**Ён быў створаны вядомым скульптарам Гэнікам Лойкам і ўсталяваны на магіле ў роднай вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна. Помнік высечаны з каменя ў форме крыжа. Ззаду — адпаліраваная паверхня, на якой напісаны вершы паэта, спераду — партрэт з надпісам, унізе — «Анатоль Сыс» і пазнакай гадоў жыцця.**




**Вершы — Анатоль СЫС.**
**Музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

*1. Жыў калісьці на Палессі*
*Майстра адмысловы,*
*Ён ствараў званы, як песні,*
*Ён вучыў іх словам.*
*І яго званы, бы людзі*
*Крывіцкага роду,*
*Не хавалі медны грудзі*
*За сваім народам.*

***Прыпеў (2 разы):***

*Званы, званы...*
*Звіняць званы...*
*На ўсе канцы*
*Звіняць званы...*

*2. Жыў калісьці на Палессі*
*Майстра адмысловы,*
*Ён ствараў званы, як песні,*
*Ён вучыў іх словам.*
*Біў пярун па тых званіцах,*
*Што натоўп склікалі,*
*Ды ад лёсу адхрысціцца*
*Людзі не жадалі.*

***Прыпеў (2 разы).***



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# «X-Factor у Беларусі» рыхтуецца да першага сезона

**Папярэдні адбор на маштабнае музычнае шоу «X-Factor у Беларусі» наблізіўся да фіналу. Да 28 мая ўключна творчая група праслухоўвае і запісвае выступленні ўдзельнікаў у сталіцы. Да гэтага кастынгі прайшлі ў розных гарадах Беларусі. І ўжо сталі вядомыя імёны настаўнікаў праекта.**













Сёлета ў красавіку Белтэлерадыёкампанія як уладальнік эксклюзіўных правоў на вакальнае шоу «X-Factor» у нашай краіне, аднавіла жывыя папярэднія кастынгі праекта. Каманда арганізатараў праехалася па ўсіх абласных і буйных гарадах Беларусі, каб праслухаць больш за тысячу яркіх і харызматычных канкурсантаў, якія жадаюць трапіць на шоу, прадэманстраваць свае артыстычныя здольнасці і даведацца пра складнікі сапраўднай папулярнасці. Варта адзначыць, што ўсе пададзеныя летась заяўкі, якія адпавядаюць правілам праекта і былі запісаныя да аб'яўлення паўзы жывых выступленняў, застаюцца сапраўднымі і будуць адбірацца экспертным журы на агульнай конкурснай аснове. Таксама і з відэазаяўкамі — яны будуць разглядацца і адбірацца журы. Калі менавіта ваша выступленне ўразіць прафесіяналаў, то з вамі звяжуцца арганізатары праекта.

Што да настаўнікаў «X-Factor у Беларусі», то імі стануць спявак і кампазітар Руслан Аляхно, прадзюсар і хіп-хоп выканаўца Сяргей Пархоменка (ён вядомы пад сцэнічным псеўданімам Серога), музычны крытык і журналіст Сяргей Саседаў, а таксама блогер, спявачка і тэлевядучая Вольга Бузава. Дарэчы, Сяргей Саседаў і Сярога былі ў якасці настаўнікаў такога шоу ва Украіне. Прэм'ера першага сезона вакальнага шоу плануецца на «Беларусь 1» ужо гэтай восенню, а пераможцу вызначаць зімой. «Гэта тая магчымасць і той праект, які, на мой погляд, можа прастымуляваць беларускі шоу-бізнес, а ў прынцыпе — вывесці яго на новы ўзровень. Мы ж нічым не горшыя за Расію ці Украіну, проста трэба ў адным праекце гэта паказаць гледачу, каб той паверыў у сваіх артыстаў», — адзначыў у інтэрв'ю на «Беларусь 1» спявак Руслан Аляхно.

Здымкі пачнуцца ў жніўні ў павільёнах кінастудыі «Беларусьфільм». Спецыяльна для шоу тут пабудуюць цэлы горад са сцэнай, сваёй інфраструктурай, грын-румам, а таксама пакоем для тэхперсаналу.

Зараз сачыць за падзеямі на шоу «X-Factor у Беларусі» можна па інфармацыйных выпусках Агенцтва тэленавін і ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» на «Беларусь 1», а таксама ў афіцыйным акаўнце праекта ў Instagram @xfactorbelarus.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзена прэс-службай Белтэлерадыёкампаніі.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05** Навіны эканомікі.
**7.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**8.05** Зразумелая палітыка.
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
**9.10, 22.35 Серыял «След»** (16+).
**10.45** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Давай знойдзем адно аднаго» (16+).**
**14.05** «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ].
**14.50, 15.25 Меладрама «Маркус» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.35** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Жанчыны і спорт (12+).
**0.15** Сфера інтарэсаў.
**1.00** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+).
**9.00, 16.25** Тэлебарометр.
**9.05, 20.15 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05. 22.30** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.15 Серыял «Другі зрок» (16+).**
**13.00, 17.20** «Арол і рэшка-3» (16+).
**14.00** Анімацыя для ўсёй сям'і «Універсітэт Монстраў» (12+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.30 «Клон». Серыял (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.25** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**23.40 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бульбяны суп з салёнай рыбай.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.35** Навіны культуры.
**8.25 «Вангелія». Маст. фільм. 11-я і 12-я серыі, заключныя (16+).**
**10.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.40, 15.55 «Снежная каралева». Маст. фільм (6+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Тушаная рыба з агароднінай.
**12.50** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**13.25, 21.05** «Легенды кіно». Міхаіл Ульянаў (12+).
**14.05, 21.45 «Далёка ад вайны». Маст. фільм. 3-я і 4-я серыі, заключныя (16+) [СЦ].**
**17.15** «Майстры і куміры». Драматург і сцэнарыст, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Аляксей Дудараў.
**19.55** «Камертон». Акцёр тэатра і кіно Яўген Нікіцін.
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**7.00** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск».
**8.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Беларусь.
**10.10** Спорт-кадр.
**10.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**11.25** На шляху да Токіа. Відэачасопіс.
**12.00, 23.25** Тэніс. «Ралан Гарос».
**14.00** Экстрым-Е. Гран-пры Дакара.
**15.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.20** Слэм-данк.
**16.50** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**18.50** Футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Азербайджан. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.50** Між іншым.
**21.10** Спорт-цэнтр.
**21.20** Чэмпіянат Беларусі па танцавальным спорце.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.20** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 22.25 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.30** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**19.00** «Аб'ектыўНа» (16+).
**20.00** Час.
**21.20 Серыял «Анатомія сэрца» (16+).**
**0.15** «BRAVE CF 51: беларусы ў справе. Прэв'ю да ММА — турніру». Дак. фільм (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 20.45, 0.55** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Глухар». Серыял (12+).**
**20.15, 23.25** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Блізняты» [СЦ] (16+).**
**6.20 Маст. фільм «Ход канём» [СЦ] (12+).**
**7.50, 10.10, 23.30, 0.10 Серыял «Опер па выкліку» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**18.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.55** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**3.15** «Свет пераможцаў» (16+).
**4.35 Маст. фільм «Падкідыш» [СЦ] (0+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35 Серыял «Снайпер-2. Тунгус» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Рая ведае ўсё!» (12+)**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.35** Ток-шоу «P.S.»
**21.05 Серыял «Па розных берагах» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 6.50, 8.20, 16.20, 19.40, 22.00, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Беларусы (6+).
**7.05** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.35** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.25, 22.05** «НЗ.by».
**9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**11.05 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).**
**12.05, 13.50 Серыял «Ліцейны» (16+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00, 19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**21.00, 22.20 Серыял «Душагубы» (16+).**
**23.45** «Справа ўрачоў» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.00, 18.05, 21.00, 1.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.10** «Мультпарад». «Скубі Ду і адгадай хто» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.55** «Дак. экран» (12+).
**10.20 Трылер «Фарсаж. Хобс Шоу» (12+).**
**12.35 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).**
**14.10 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**15.05, 20.45 М/с «Хачу ў Парыж» (6+).**
**15.45 Драма «Затаіўшы дыханне» (16+).**
**18.10 Серыял «Кантакт» (16+).**
**19.55 Серыял «Танцы на лёдзе» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.05 Трылер «Ідэнтыфікацыя Борна» (12+).**
**23.00 Трылер «Казіно «Раяль» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.20** Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
**10.45** «Лаві момант» (16+).
**11.40** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**13.15** «Наш рамонт» (16+).
**13.45** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**16.20** Шоу «Дзіцячы КВЗ» (6+).
**17.25, 1.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.30, 3.25** Серыял «Усход—Захад» (16+).
**20.30** Шоу «Поўны блэкаўт» (16+).
**22.05** Меладрама «Адна сустрэча» (16+).
**23.35** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.00** Жахі «Сламбер: лабірынт сну». (18+).
**4.55** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Вялікія Вязёмы.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**8.15, 2.10** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**8.35, 16.20** «Прафесія — следчы». Маст. фільм.
**9.30, 17.15** Раман у камені.
**10.20** «Пуцёўка ў жыццё». Маст. фільм.
**12.20** Колер часу. Міхаіл Урубель.
**12.30** «Шахеразада». Серыял.
**13.35** «Канстанцін Сяргееў. Урокі жыцця». Дак. фільм.
**14.15** Улада факта. «Імперыя Бісмарка».
**15.05** Лісты з правінцыі. Рэспубліка Адыгея [СЦ].
**15.35** «Энігма. Андрэй Золатаў. Гутарка пра Мравінскага».
**17.45** Людвіг Ван Бетховен. Гістарычныя канцэрты. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам. Егудзі Менухін, Колін Дэвіс і Лондански сімфанічны аркестр.
**18.45** Больш, чым каханне. Таццяна Пельтцэр і Ганс Тэйблер.
**19.45** «Смеханастальгія».
**20.15** Лінія жыцця. Андрэй Буркоўскі [СЦ].
**21.10** «Карчма на Пятніцкай». Маст. фільм.
**22.40** «2 Вернік 2». Яўген Ткачук і Элеанора Севенард.
**23.50** «Арвентур». Маст. фільм.
**1.25** Шукальнікі. «Дзе знаходзіцца радзіма залатога руна?»
**2.25** «Персей». «Каралеўская гульня». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Сняем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
**7.10** Маст. фільм «Зладзеі ў законе» (16+).
**8.35, 9.40, 11.00, 14.10, 15.40, 17.00, 19.05, 20.50, 21.40, 23.00, 1.15, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00,15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00,16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** Фільм-спектакль «Сыходзячы, азірніся...» (16+)
**18.00** «Да і пасля...» 2010 год (16+).
**19.15** Тэлеспектакль «Да новых сустрэч!» (16+)
**22.00** «Колба часу» (16+).
**23.25** «Блеф-клуб». 1999 год (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Тэатральная рэвалюцыя часоў перабудовы». 2006 год (16+).
**1.30** Маст. фільм «Амерыканскі дзядуля» (16+).

## EuroSport 1

**1.15, 4.00, 7.00** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ» (12+).
**2.30, 5.30, 8.00, 10.30** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
**9.30** Кулявая стральба. Чэмпіянат Еўропы. Харватыя (12+).

## Кінакамедыя

**1.05** Укол парасонам (16+).
**3.15** Supergнянь (16+).
**4.45** Supergнянь-2 (16+).
**6.25** Зачараваная Эла (12+).
**8.10** Запалі гэтым летам (16+).
**9.55** Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
**11.30** Тупы і яшчэ тупейшы-2 (16+).
**13.30** Дастаць карантышку (16+).
**15.25** Целаахоўнік кілера (18+).
**17.35** Эвалюцыя (12+).
**19.30** Герой супермаркета (12+).
**21.05** Таўстун супраць усіх (16+).



**22.50** Звычка расставацца (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.25** «Паглядзім» (12+).
**10.00, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.05, 2.30** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.00, 4.05** «Сляпая» (16+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 3.20** «Містычныя гісторыі» (12+).



**15.20** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.55** «Ведзьмакі свету» (16+).
**16.55** «Нечысць» (16+).
**19.35** «Звышнатуральны адбор» (16+).
**20.40** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**21.45** Камедыя «Мы — Міперы» (16+).
**23.50** Маст. фільм «Азартныя гульні» (16+).
**1.45** «90-я» (16+).

## ТБ1000

**5.00, 17.20** Доктар Хаус (16+).



**6.50, 14.55** Еш, маліся, кахай (16+).
**9.15** Вялікія вочы (16+).
**11.00** Прымадонна (16+).
**13.00** Афера Томаса Краўна (16+).
**19.00** Анёлы Чарлі (12+).
**20.40** Анёлы Чарлі: толькі наперад (12+).
**22.30** Скарб Амазонкі (16+).
**0.15** Застанься (16+).
**1.50** Добра быць ціхоняй (16+).
**3.30** Пампушка (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Каханне з акцэнтам (16+).
**7.30** Выратаваць Ленінград (12+).
**9.05** Данбас. Ускраіна (12+).
**10.55** 9-я рота (16+).
**13.15, 19.00** Адваротны бок Месяца (16+).
**15.15** Дар (16+).
**16.55** Кіроўца для Веры (16+).
**20.55** Край (16+).
**23.00, 2.40** Граніца. Таежны раман (16+).
**1.15** Дарагі тата (12+).
**2.40** Правадыр разнаскурых (16+).

## National Geographic

**6.25, 2.40** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**7.15** Сапраўдны супер-кар (16+).
**8.10** У дзікай прыродзе (16+).
**9.00** Тэхаскі ўлоў (16+).
**9.50, 13.20, 22.45** Аўта-SOS (16+).
**11.35** Дзікі тунец (16+).
**12.25, 15.50, 19.15, 0.25** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.10** Ліхтугі за мяжой (16+).
**14.55** Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
**17.30** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.20** Драўляная скура (16+).
**21.00, 3.30** Будзе шторм (16+).
**21.50** Мегазаводы (16+).
**23.35** Недаследаваныя глыбіні (16+).
**1.55** Турэмныя цяжкасці (16+).
**4.15** Асушыць акіян (16+).
**5.05** Фабрыка ежы (16+).
**5.40** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42, 3.30** Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
**8.46, 16.48, 22.12** Аўтасвет Майка Бруера (12+).
**9.39, 20.24** Бітва за нерухомасць (12+).
**10.32, 15.00, 21.18** Дзіўны свет жывёл (12+).
**11.25** Круты цюнінг (12+).
**12.18** Залаты прыіск Фрэдзі Доджа (16+).
**13.12** Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
**14.06** Сталёвыя хлопцы (12+).
**15.54, 1.47** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў (16+).
**18.36, 2.40** Крутая праца Аарона Каўфмана (12+).
**19.30, 4.15** Геній аўтадызайну (12+).
**23.06, 5.45** Смяротны ўлоў (16+).
**0.00, 6.30** Паліцыя Іспаніі (16+).
**0.54. 7.15** Аэрапорт Варшавы (12+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+)

## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** «Зона X». Крымінальная хроніка (16+).
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхаванне на II ступені Агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.45** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Меладрама «За крок ад раю» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.50, 15.25 Меладрама «Маркус» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** «Зона X». Вынікі тыдня (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**22.50 Меладрама «Няшчасны выпадак». 1-я — 4-я серыі (16+).**
**2.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.25** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00** «На нажах» (16+).
**10.55, 18.25 Серыял «Другі зрок» (16+).**
**12.55** «Тры першыя спатканні» (16+).
**13.40** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.15** «Арол і рэшка-3» (16+).
**15.15** М/с «Цімон і Пумба» (0+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.30 «Клон». Серыял (16+).**
**17.25** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**20.25, 21.15** «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.45 Прыгоды «Трон. Спадчына» (12+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Пірог слаёны блінны з птушкай і грыбамі.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.35** Навіны культуры.
**8.25, 18.05 «Чырвоная каралева». Маст. фільм (16+).**
**10.20** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.50, 15.45 «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі». Маст. фільм (6+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Рыбны квас.
**12.50** «Сіла веры».
**13.15, 21.05** «Легенды кіно». Уладзімір Этуш (12+).
**13.55, 21.45 «Паршывыя авечкі». Маст. фільм. 3-я і 4-я серыі, заключныя (16+) [СЦ].**
**16.55** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**17.10** «Майстры і куміры». Артыстка балета, педагог, народная артыстка Беларусі Людміла Бржазоўская.
**19.55** «Рэдакцыя» з Барысам Герстэнам. Беларускія хронікі Віктара Шавялевіча.
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**6.40** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.
**8.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-21). 1/2 фіналу.
**10.30** Чэмпіянат Беларусі па танцавальным спорце.
**12.00, 23.10** Тэніс. «Ралан Гарос».
**14.05** Футбол. На шляху да ЧС-2022. Відэачасопіс.
**14.40** Вось гэта спорт!
**15.00, 21.30** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы.
**16.20** Валейбол. Залатая Еўраліга. Жанчыны. Харватыя — Венгрыя.
**18.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.35** Фактар сілы.
**19.10, 21.20, 23.00** Спорт-цэнтр.
**19.20** Валейбол. Залатая Еўраліга. Жанчыны. Беларусь — Чэхія.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.45** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.15** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Тры акорды» (16+).
**22.55** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Летняя серыя гульняў (16+).
**0.20** «Міжнародны турнір па зменшаных адзінаборствах BRAVE CF 51» (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 20.45, 0.55** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Смак забойства». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Першая пальчатка» (0+).**
**5.15 Маст. фільм «Дача» [СЦ] (0+).**
**6.40, 10.40 Серыял «Опер па выкліку» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» [СЦ] (16+).**
**19.15** «Слабае звяно» (12+).
**20.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**21.40 Маст. фільм «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, ці На Брайтан-біч ідуць дажджы» (16+).**
**23.35** «Начны экспрэс». Найк Барзоў (12+).
**0.55 Маст. фільм «Арлет» (16+).**
**2.30 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).**
**4.00** М/ф (0+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Токшоу (12+).
**12.35 Серыял «Снайпер-2. Тунгус» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Рая ведае ўсё!» (12+)**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.45, 23.10 Меладрама «Моцная ты» (12+).**
**0.20** «Лёс чалавека» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 6.50, 8.20, 16.20, 19.40, 22.00, 23.35** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Беларусы (6+).
**7.05** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.35** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.55** Навукаманія «(6+).
**9.25** «НЗ.by».
**9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**11.05 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).**
**12.05, 13.50 Серыял «Ліцейны» (16+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00, 19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**21.00, 22.30 Серыял «Душагубы» (16+).**
**22.05** «НЗ.by: час вынікаў».
**23.50** «Па следзе монстра» (16+).

## 8 канал

**7.00, 14.50, 19.40, 21.00, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 14.55** «Мультпарад». «Скубі Ду і аддагадай хто» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.55** Дак. серыял «Уэльс — дзікая зямля» (12+).
**10.45 Фантастыка «Звар'яцелы Макс. Дарога лютасці» (16+).**
**12.45 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).**
**14.00 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**15.20, 20.45** М/с «Хачу ў Парыж» (6+).
**15.25** «Гатуй як шэф» (12+).
**15.45 Драма «Затаіўшы дыханне» (16+).**
**18.05 Серыял «Кантакт» (16+).**
**19.45 Серыял «Танцы на лёдзе» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.05 Трылер «Ультыматум Борна» (16+).**
**23.00 Драма «Стралок» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.20** Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
**10.45** «Лаві момант» (16+).
**11.40, 21.30** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**13.15, 2.55** Серыял «Вароніны» (12+).
**16.20, 2.00** Серыял «Як я стаў рускім» (16+).
**17.25** «Уральскія пельмені». (16+).
**18.30, 3.50** Серыял «Усход—Захад» (16+).
**20.30** Серыял «Па калена» (16+).
**23.00** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**5.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Серпухаў купецкі.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 18.35** «Вялікая французская рэвалюцыя». Дак. фільм [СЦ].
**8.35, 16.20** «Прафесія — следчы». Маст. фільм.
**9.50** Колер часу. Мікеланджэла Буанароці. «Страшны суд».
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.50** XX стагоддзе. «Што такое «Ералаш»?» Вядучы Спартак Мішулін.
**12.25**, 23.50 «Шахеразада». Серыял.
**13.20** Казкі з гліны і дрэва. Філімонаўская цацка.
**13.30** «Кацярына Яланская. Жывы тэатр». Дак. фільм.
**14.15, 17.30** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**14.30** «Стагоддзе дзіцячай кнігі». Дак. серыял [СЦ].
**15.05** «Біблейскі сюжэт».
**15.35** «Белая студыя».
**17.45, 1.55** Людвіг Ван Бетховен. Гістарычныя канцэрты. Канцэрт № 4 для фартэпіяна з аркестрам. Клаўдыё Арау, Леанард Бернстайн і Сімфанічны аркестр Баварскага радыё.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Абсалютны слых.
**21.30** Улада факта. «Імперыя Бісмарка».
**22.15** «Дом мадэляў». Фільм 3-і [СЦ].
**22.45** Дакументальная камера. «Адліга» старэйшага пакалення, або Другое дыханне».
**2.45** Колер часу. Міхаіл Урубель.

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок — адышоўшае. А. Башлачоў». 2005 год (18+).
**7.00, 8.35, 9.40, 11.00, 13.15, 14.45, 15.40, 17.00, 20.35, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Паветраныя піраты» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 0.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Тэатральная рэвалюцыя часоў перабудовы». 2006 год (16+).
**13.30** Маст. фільм «Амерыканскі дзядуля» (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
**19.10** Маст. фільм «Зладзеі ў законе» (16+).
**2.00** «Навагодні паказ». 1986 год (12+).
**4.00** Маст. фільм «Ты ў мяне адна» (18+).

## EuroSport 1

**1.15** Ралі-рэйд. Extreme E (12+).
**2.15, 4.00, 7.00, 9.30** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ» (12+).
**2.30, 5.30, 8.00, 10.30** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).

## Кінакамедыя

**1.05** Каханне без правілаў (16+).
**2.50** Усё ўключана-2 (16+).



**4.35** Таксі (16+).
**6.05** Таксі-2 (16+).
**7.45** Копы ў глыбокім запасе (16+).
**9.40** Вельмі небяспечная штучка (16+).
**11.20** Целаахоўнік кілера (18+).
**13.30** Абяцаць — не значыць ажаніцца (16+).
**15.55** Запалі гэтым летам (16+).
**17.35** Канваіры (16+).
**19.30** Мы — Мілеры (16+).
**21.35** Дастаць карантыншку (16+).
**23.30** Аферысты Дзік і Джэйн (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусфільма» (12+).
**7.45** «Ваўчынае сонца». Маст. фільм (12+).
**9.40** «Перыскоп» (16+).
**10.00, 15.25, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.05** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.2, 2.50** «Сляпая» (16+).
**13.10. 19.35** «Варажбітка» (16+).
**13.45, 3.45** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.45** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.25** «Ганна — дэтэктыў». Серыял (16+).
**20.45** «Добры доктар». Серыял (16+).
**22.35** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**23.40** «Глядзі сам» (16+).
**23.55** «10 самых» (16+).
**0.30** «Лінія абароны» (16+).
**1.05** «Квант міласэрнасці». Маст. фільм (16+).

## ТБ1000

**5.00, 17.20** Доктар Хаус (16+).
**6.50** Інструкцыі не прыкладаюцца (12+).
**8.55** Цуд (12+).
**10.50** Дзённікі нянькі (16+).
**12.40** Таленавіты містар Рыплі (16+).
**15.05** Разумніца Уіл Хантынг (16+).
**19.00** Кілеры (16+).
**20.40** Містар і місіс Сміт (16+).
**22.45** Дывергент (12+).
**1.00** Дывергент, кіраўнік-2: інсургенты (12+).
**2.55** Дывергент, кіраўнік-3: за сцяной (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.40** Кіліманджара (16+).
**6.55** Правадыр разнаскурых (16+).



**8.25** Дарагі тата (12+).
**9.55** Неадэкватныя людзі (16+).
**11.45** Неадэкватныя людзі-2 (16+).
**13.55, 19.00** Адваротны бок Месяца (16+).
**16.05** Унук касманаўта (12+).
**17.30** Баця (16+).
**20.55** Апошняе выпрабаванне (16+).
**23.15** Прайгранае месца (16+).
**0.55** Тэкст (18+).
**3.15** Край (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.20, 2.35** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**7.15** Сапраўдны суперкар (16+).
**8.05** У дзікай прыродзе (16+).
**9.00** Тэхаскі ўлоў (16+).
**9.50, 12.25, 16.35, 22.35** Аўта-SOS (16+).
**11.30** Дзікі тунец (16+).
**14.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**14.55** Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
**15.45, 19.15, 0.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.30** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.20** Драўляная скура (16+).
**21.00, 3.20** Непакорлівы востраў (16+).
**21.45** Аляска: новае пакаленне (16+).
**23.25** Недаследаваныя глыбіні (16+).
**1.50** Турэмныя цяжкасці (16+).
**4.05** Асушыць акіян (16+).
**4.55** Фабрыка ежы (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42, 3.30** Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары: машына мары (12+).
**9.39, 20.24** Бітва за нерухомасць (12+).
**10.32, 15.00, 21.18** Дзіўны свет жывёл (12+).
**11.25** Махінатары (12+).
**12.18** Узрываючы гісторыю (12+).
**13.12** На дне акіяна (16+).
**14.06** Штаб-кватэры Гітлера (16+).
**15.54,1.47** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў (12+).
**18.36, 2.40** Крутая праца Аарона Каўфмана (12+).
**19.30, 4.15** Геній аўтадызайну (12+).
**23.06, 5.45** Голыя і напалоханыя (16+).
**0.54, 7.15** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+)

# БІЗНЕС З ЖАНОЧЫМ УХІЛАМ

## У Магілёве абмеркавалі нюансы жаночага прадпрымальніцтва

**Гэта адбылося падчас круглага стала пад эгідай Беларускага саюза жанчын. Як адзначыла старшыня арганізацыі, намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН, гэта мерапрыемства ідзе ў развіццё Усебеларускага народнага сходу. Калі Беларускі саюз жанчын праводзіў дыялогавыя пляцоўкі, паступала шмат розных прапаноў. І сярод іх — пажаданні жанчын-прадпрымальніц, якія сёння займаюць актыўную сацыяльную і грамадскую пазіцыю, рэалізоўваюць вельмі важныя для краіны праекты.**

### Рашучыя, сацыяльна адказныя, перспектыўныя...

Менавіта такім якасцям адпавядаюць прадпрымальныя жанчыны, якія імкнуцца дапамагчы краіне ў складаны перыяд жыцця. Хто яшчэ, як не маці, захавальніца дамашняга ачага, разумее, як важна зберагчы стабільнасць і спакой, стварыць умовы для развіцця дзяржавы, захаваць яе палітычную і эканамічную незалежнасць.

— Сёння жанчыны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі грамадскага і сацыяльнага жыцця ў нашай краіне, — падкрэсліла Алена Богдан. — Яны гатовыя не толькі весці свой бізнес, але і вырашаць нейкія сацыяльныя праблемы, браць на сябе сацыяльную адказнасць. І гэт вельмі важная падтрымка дзяржавы. Таму тэма ў Магілёве і абмяркоўваецца з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, падатковых і банкаўскіх органаў, жанчынамі, якія прадстаўляюць інтарэсы вобласці ў Нацыянальным сходзе, а таксама Беларускі саюз жанчын на абласным узроўні. Нам цікавы ўсе нюансы, каб разумець, якія прапановы па змяненні трэба ўнесці ў дакументы заканадаўчай і нарматыўна-прававой базы. Каб у Год народнага адзінства мы былі разам і чулі тых людзей, якія праяўляюць актыўную грамадскую пазіцыю.



Перад пачаткам мерапрыемства дэлегацыя наведала шэраг аб'ектаў аграэкатурызму, асабістых дапаможных гаспадарак. **Святлана МАХАНЬКОВА, гаспадыня аграсядзібы «Шэрая шыйка»,** што ў Магілёўскім раёне, расказала аб асаблівасцях вядзення свайго бізнесу. Яна спалучае гэты від дзейнасці з фермерствам.

— Такім чынам мы забяспечваем сваіх кліентаў натуральнымі прадуктамі, — удакладніла яна. — Частуем пірагамі з ягадамі і свойскім сырам. Спецыяльна завялі козачак, каб рабіць гэты карысны прадукт.

Аграсядзіба сёння карыстаецца нязменным поспехам, але ўсё гэта дзякуючы няспыннай працы ўладальніцы і яе сям'і. Яна прызналася, што трэба ўвесь час удасканальвацца, прыдумваць нешта новае. Сёння турыста не заманіш, калі няма інтэрнэту або магчымасці разлічыцца банкаўскай карткай. Нават ёсць вопыт арганізацыі анлайн-экскурсіі па кантактным заапарку, які знаходзіцца на тэрыторыі аграсядзібы.

— Наша аграсядзіба ўваходзіць у кластар «Край жыватворных крыніц», — адзначае Святлана. — Ён аб'ядноўвае сем аграсядзіб. І гэта цудоўна. Мы не толькі рэкламуем адзін аднаго, у нас ёсць магчымасць абмяняцца вопытам, вырашаць нешта па заканадаўстве.

Святлана не хавае, што працаваць даводзіцца шмат, але калі побач ёсць аднадумцы, нічога непераадольнага няма. Ёсць дапамога і з боку дзяржавы. Тую ж канферэнц-залу прадпрымальніца адбудавала на грошы льготнага крэдыту. Але ёсць патрэба не толькі ў крэдытах. Да сядзібы ад вёскі няма і паўкіламетра, а вось з дарогай бяда. Прадпрымальніца ўвесь час клапоціцца, каб за свой кошт падтрымліваць дарогу ў прымальным стане. Але гэта вельмі дорага. Чаму б сюды асфальт не пакласці? Але гэта ўжо кампетэнцыя іншых службаў. Справа ж не прыватная. Людзі едуць адпачываць, а тут такія нязручнасці.



### Жанчыны «руляць»

Год таму ў Магілёве была зарэгістравана прыватная сацыяльна-інфармацыйная ўстанова па падтрымцы жанчын «Жаночы дом». Адзін з яе кірункаў — менавіта жаночае прадпрымальніцтва.

— Дапамагаем жанчынам знайсці сваю справу і развівацца, — удакладняе **дырэктар «Жаночага дома» Крысціна ГЛАДЧАНКА.** — Праводзім курсы анлайн, афлайн, семінары, іншыя мерапрыемствы. Нават ёсць ужо і выпускніцы, якія адкрылі свой бізнес і зарэгістраваліся. Такія вынікі ў нас адбыліся літаральна за тры месяцы. Сярэдні ўзрост нашых кліентак 25—45 гадоў.

Вельмі часта жанчына проста не ведае, як раскрыць сябе, і тут ёй аказваюць усялякую падтрымку: пачынаючы ад кансультацый па рэгістрацыі і адкрыцці ІП і да канкрэтнай дапамогі ў працэсе вядзення бізнесу.

— Жанчыны прызнаюцца, што ім вельмі складана бегаць з дакументамі, афармляць бізнес. Гэта здаецца настолькі страшным, што некаторыя наогул адмаўляюцца ад ідэі. І нашы эксперты ім вельмі добра дапамагаюць справіцца з гэтымі жахамі, — падкрэслівае Крысціна.

Адным з экспертаў з'яўляецца Вольга Мамаева, яна спецыялізуецца на аказанні бухгалтарскіх паслуг і вядзе ў «Жаночым доме» прадпрымальнікаў.

— Жанчыны, якія прыходзяць да нас, атрымліваюць магчымасць раскрыць свой патэнцыял і прыйсці да высновы, што займацца бізнесам рэальна, — расказвае яна. — Прыходзіцца змагацца з іх страхамі, што бізнес — гэта спрэс рызыкі. Яны чуюць аб праверках, штрафах, што кагосьці закрылі, кагосьці прыцягнулі да адказнасці. Але гэта чуткі, у якіх трэба разабрацца. Вядзенне бізнесу — працэс, і гэтым трэба займацца. Мы дапамагаем паверыць у сябе і пачаць сваю справу.

Жаночае прадпрымальніцтва ў рэгіёне становіцца вельмі важнай часткай яго эканамічнага развіцця.

— У нас 3260 жанчын з'яўляюцца заснавальнікамі або сузаснавальнікамі камерцыйных арганізацый, — паведаміў



**Руслан СТРАХАР, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама.** — Сферы і кірункі іх дзейнасці самыя розныя. Традыцыйна гэта сфера паслуг, але жанчыны актыўна працуюць і ў сферах вытворчай дзейнасці, на лесанарыхтоўках і нават у такіх складаных сферах, як будаўніцтва і транспартная дзейнасць. Для нас вельмі важна, каб прадпрымальніцкі сектар працягваў развівацца. Для гэтага мы ствараем умовы. І вельмі добра, што ў Савеце па развіцці прадпрымальніцтва Магілёўскай вобласці таксама ёсць жанчыны, якія маюць магчымасць выказаць сваё меркаванне і паўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў.

### Рамяство — культура або бізнес



**Старшыня грамадскага аб'яднання магілёўскіх рамеснікаў «Шчырая майстэрня» Ала СМАЛЯКОВА** усё ж такі схіляецца да таго, што таксама бізнес.

— Хоць раней лічылася, што — культура, — усміхаецца яна. — Бо гэта хутчэй спосаб самавызначыцца, чым зарабіць. І нават сёння каля 70 % нашай суполкі лічыць, што рамяство — гэта творчасць. Але гэта няправільна: рамяство павінна прыносіць даход. Хобі — гэта добра, але яно павінна выходзіць на больш высокі ўзровень магчымасці. Безумоўна, гэта немагчыма без падтрымкі дзяржавы. Ёсць субсідзіраванне для пачаткоўцаў, але такая дапамога патрэбна больш вопытным рамеснікам. Адна наша майстрыха хацела купіць вышывальную машыну, але грошай не хапала. А для таго, каб атрымаць субсідыю, ён прыйшлося б стаць беспрацоўнай і пэўны час стаяць на біржы майстрам. Гэта ненармальна. І дзе гарантыя, што той пачатковец скарыстаецца дапамогай, а потым зразумее, што гэта не яго прызначэнне ў жыцці. Мне здаецца, што ў такіх пытаннях трэба навесці парадак.

Рамяство — вельмі ўразлівы від дзейнасці. Ала згадвае, што летась майстрам было настолькі цяжка, што некаторыя з іх змянілі творчасць на больш прыземленыя віды дзейнасці. Трэба ж неяк карміцца. Магілёўскі гарвыканкам даў майстрам магчымасць крыху паправіць свой стан. Сёлета да іх паслуг — пешаходная вуліца, дзе яны тры дні на тыдзень з мая да лістапада могуць прапаноўваць свае тавары і паслугі.

— Шмат хто ад нас сышоў, але засталіся самыя моцныя, — аптымістычна кажа Ала Смалякова. — Сёння ў нашым аб'яднанні 26 чалавек, 23 з якіх — жанчыны. Рамёствы — больш жаночая прывілея. Жанчыны больш цярплівыя, уседлівыя і сканцэнтраваныя на стварэнне прыгажосці вакол сябе.

Круглы стол згуртаваў найбольш актыўных і пазітыўных бізнесвумен. А галоўнае — нагадаў пра тое, што яны патрэбны краіне, што пра іх памятаюць і гатовы дапамагаць.



— Вельмі добра, што на Магілёўшчыне столькі актыўных жанчын, — падкрэсліла **Інэса КАРАТКЕВІЧ, намеснік старшыні праўлення Белспажыўсаюза.** — І добра, што ў развіцці жаночага прадпрымальніцтва зацікаўлена і мясцовая ўлада. Гэта дало магчымасць правесці нам адкрыты канструктыўны дыялог. Вельмі важна разумець на ўсіх узроўнях улады, што яшчэ неабходна зрабіць з боку дзяржавы, каб актыўны жаночы рух развіваўся не толькі ў грамадскім кірунку, але і ў прадпрымальніцкім. Любая жанчына, па сутнасці, настроена на стварэнне, і ўсе тыя праекты, якія рэалізоўваюцца на Магілёўшчыне, гэта пацвярджаюць. Мы сёння кажам пра падатковыя льготы, прэферэнцыі ў банкаўскай сферы, разглядаем механізмы, якія яшчэ трэба ўкараніць для развіцця жаночага прадпрымальніцтва. Гэта вялікі патэнцыял, і мы павінны даць магчымасць яму раскрыцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

# Добраўпарадкаванне, водпускі і якасць паслуг

**Сенатар Аляксей НЯВЕРАЎ правёў выязны прыём грамадзян на базе ААТ «Гомельскае вытворчае аб'яднанне «Крышталь» — кіруючая кампанія холдынга».**

Агучаныя заяўнікамі пытанні датычыліся якасці жыллёва-камунальных паслуг і добраўпарадкавання тэрыторый, парадку прадастаўлення працоўных водпускаў.

— Звароты грамадзян закранулі не толькі асабістыя пытанні, але і ўтрымлівалі розныя канструктыўныя прапановы з улікам патрэб жыхароў Гомеля ў цэлым, — растлумачыў сенатар.

Па ўсіх пытаннях дадзены тлумачэнні, вырашэнне асобных праблем будзе знаходзіцца на кантролі.

# ЮБІЛЕЙ — ЦУДОЎНАЯ НАГОДА

**Сенатар Таццяна АБЕЛЬ стала госцяй ранішняга эфіру абласной радыёстанцыі «Праўда Радыё», якая дзейнічае ў Гомелі.**

Падчас эфіру яна пазнаёміла слухачоў абласнога цэнтра з парламенцкай дзейнасцю, расказала гісторыю стварэння цырка імя Валерыя Абеля і пра цыркавыя традыцыі, а таксама аб планах на найбліжэйшую будучыню.



Трэба сказаць, што 60-годдзе цырка адсвяткавалі днямі ў Палацы культуры «Касцюкоўка» Гомеля, дзе прайшло ўрачыстае мерапрыемства «Няхай жыве наш цырк, планета чараўніцтва і натхнення». З 1985 года мастацкім кіраўніком гэтага цырка з'яўляецца Таццяна Абель.

— Я хачу павіншаваць не толькі каманду цырка, але і наш мікрараён Касцюкоўку. — З 1961 года, калі цырк быў заснаваны, жыхары мікрараёна назіралі, як гэты калектыў расце. І сёння мы бачым, што ён запатрабаваны, стаў шматжанравым і шматлікім. Хачу адзначыць, што наш поспех залежыць ад адказнасці, якая ўскладзена на кіраўнікоў, ад дзяцей, чые шчаслівыя вочы бліжэй ад таго, што яны робяць, і ад працавітай прафесійнай каманды, — падкрэсліла сенатар.

# ДАРОГІ, ДРЭВЫ, ПОМНІКІ, КЛУМБЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Яшчэ адна праблема добраўпарадкавання тэрыторыі звязана з выдаленнем старых дрэў. Паводле меркавання Валянціны Валасюк, вялікая колькасць дрэў у найбуйнейшых населеных пунктах была пасаджана прыкладна ў адзін час. І таму амаль аднолькавыя дрэвы вычарпалі свой рэсурс: адны сталі аварыйнымі, іншыя проста састарэлі і патрабуюць замены. А гэта вялікая работа. Вось і на бягучы год сельвыканкам запрасіў дазвол у адпаведных структур на знос 19 дрэў. У названай рабоце мясцовай уладзе дапамагаюць два сельгаспрадпрыемствы, якія размешчаны на тэрыторыі, а таксама Астроміцкае лясніцтва.



Помнік у Шамятоўцы.

«А вось падтрымліваць знешні выгляд вёскі ў належным стане ў нас стараюцца ўсе», — заўважае Валянціна Пятроўна. У гэтым пытанні прыклад паказвае сярэдняя школа. Школьны двор, навакольная тэрыторыя з ранняй вясны да позняй восені патанае ў кветках, настаўнікі-энтузіясты разам з вучнямі вырабляюць розныя кампазіцыі, малыя архітэктурныя формы, каб аздобіць школьны двор. ААТ «Астраміцы» перад канторай разбіла аграмадную клумбу. Цікава афармляюць сваю тэрыторыю лясніцтва, музычная школа, школы ў іншых населеных пунктах, сельгаспрадпрыемства «Племзавод «Дружба».

У вёсцы Шамятоўка, куды мы выправіліся са старшынёй сельскага Савета, выгадна вылучаецца агульны двор сельскага Дома культуры і пошты. Двухпавярховы будынак вельмі стары, узведзены недзе адразу ў пасляваенны час, сёння меў бы выгляд даволі пануры, каб работнікі клуба на чале з яго загадчыцай-бібліятэкарам Наталляй Андраюк не прыбралі хораша двор. Кветкі, розныя ўпрыгажэнні на маленькіх акуратных клумбах робіць тэрыторыю жывой, прывабнай, вясёлай. А вось чуткі аб тым, што іх культурную ўстанову могуць закрыць ужо сёлета, вельмі засмучаюць жыхароў. Для Шамятоўкі, дзе пражывае каля 200 жыхароў, гэта будзе адчувальная страта.



Новы ўчастак дарогі.

Літаральна насупраць Дома культуры, праз дарогу, устаноўлены помнік ваенным падзеям. Яго паставілі некалькі дзесяцігоддзяў таму ў гонар землякоў, якія загінулі на франтах і падчас акупацыі. Зараз помнік патанае ў навакольных зарасніках бэзу. Тэрыторыя яго дагледжаная, прыведзеная ў парадак, фрагменты манумента пафарбаваны і ачышчаны яшчэ напярэдадні 9 Мая.

— Усяго на тэрыторыі сельсавета ўстаноўлена 16 помнікаў, прысвечаных падзеям вайны, — расказвае старшыня выканкама. — Падтрымліваем парадак вакол іх на працягу года. Для гэтага кожны абеліск замацаваны за ўстановай адукацыі альбо арганізацыяй, установай. А штогадовы вясновы рамонт становіцца клопатам выканкама. Многія памятныя знакі даволі старыя, яны патрабуюць рэгулярнага абнаўлення. Бывае, пачысціш, пафарбуеш, а літаральна праз месяц абеліск зноў пацямнеў ад дажджу ці снегу, даводзіцца брацца за фарбу і пэндзаль зноў. Але ж гэта наш абавязак перад памяццю, і мы яго выконваем, — падсумавала кіраўнік мясцовай улады.

На гэтым тыдні на пасяджэнні Астроміцкага сельвыканкама дэпутаты таксама разгледзелі пытанне добраўпарадкавання тэрыторыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

# Нашчадкам — пра зямлю бацькоў

## Сельвыканкам паспрыяў выданню кнігі пра Чэрск і правёў прэзентацыю выдання

**Кніга пад назвай «Зямля бацькоў — зямля святая» ўбачыла свет вясной гэтага года і амаль адразу стала бібліяграфічнай рэдкасцю. Яе аўтар Вольга Стаднік і не думала, што столькі цяперашніх жыхароў, іх нашчадкаў, даўніх выхадцаў з Чэрска захочуць набыць выданне. Але гэта і радуе: значыць, цікавяцца людзі гісторыяй свайго краю, не забываюць, адкуль пайшоў іх род.**



Вольга СТАДНІК і Мікалай ГАНЧАРОЎ.

> Для справы выхавання маладога пакалення веданне сваёй гісторыі, пашана да мінулага малой радзімы становіцца ўрокам, які цалкам не здольная замяніць тэорыя.

Вольга Дзмітрыеўна — былая настаўніца, 43 гады адпрацавала ў школе. Так сталася, што збіраць гісторыю свайго пасялення, запісваць расказы землякоў пачала амаль выпадкова. Расказвала, што спачатку нейкі матэрыял патрабаваўся на класныя гадзіны, потым усёй школай збіралі звесткі для раённай кнігі «Памяць». Так паступова захапілася справай, што стала запісваць усё і заўсёды. Нават калі яе хворую маці прыходзілі адведваць зусім пажылыя суседзі і згадвалі гісторыі са сваёй маладосці, занатоўвала іх у сшытак. Як яны потым спатрэбіліся, нават калі працавала ў архівах!

Такім чынам, за некалькі дзесяцігоддзяў матэрыялаў у яе сабралася многа і пра гісторыю, і пра землякоў, але ўсе яны да часу былі ў розных сшытках ды папках, патрабавалася іх сістэматызацыя. Ды ў пенсіянеркі рукі не даходзілі. Пра гэта неяк зайшла гаворка са старшынёй Дамачаўскага сельскага Савета Анатолем Струком. Літаральна назаўтра Анатоль Іванавіч прывёз камп'ютар і прапанаваў прыводзіць у сістэму ды пісаць. І яна засела за работу, выпраўляла, дапрацоўвала, перакладала на беларускую тое, што было напісана па-руску. Так паступова вымалёўваўся гісторыка-краязнаўчы нарыс «Зямля бацькоў — зямля святая».

Сельвыканкам узяў на сябе клопат пра выданне. Кнігу аддрукавалі ў адным са сталічных выдавецтваў. А на прэзентацыю твора сабраліся пажылыя і моладзь, прыйшлі вучні Дамачаўскай школы са сваімі настаўнікамі, нават камандзір найбліжэйшай пагранічнай заставы праявіў цікавасць да мерапрыемства.

На прэзентацыі аўтар расказала шмат цікавых фактаў пра Чэрск, якія для многіх прадстаўнікоў маладшага пакалення сталі сапраўдным адкрыццём. Ну, напрыклад, пасля вайны ў Чэрску быў такі бум нараджальнасці, што ў вёсцы адкрылі філіял радзільнага дома. А наогул вёсцы больш за 300 гадоў. І ўвесь гэты час у населеным пункце працуе царква, якая ніколі не закрывалася.

Самы большы раздзел кнігі прысвечаны ваенным падзеям. Вайна стала страшным выпрабаваннем для Чэрска. За час акупацыі тут расстралялі 31 чалавека. Забівалі пры любым падазрэнні на тое, што быў камуністам, актывістам, што нейкім чынам спачуваў савецкай уладзе. У 1944 годзе на вайну прызвалі 66 мужчын, 20 з іх загінулі. Пра іх, франтавікоў, ёсць асобныя аповеды ў кнізе. Як і пра іншых землякоў, якія праславілі вёску шматгадовай працай.

З вялікай любоўю піша аўтар пра сваіх землякоў, пра іх таленты, пра любоў да песні. «Наш хор славіўся на ўсю акругу. А школьнікі на любых аглядах самадзейнасці вызначаліся, першае месца нязменна займалі», — сказала аўтар кнігі, звяртаючыся да цяперашніх вучняў. А яшчэ прывяла радкі з уласнага верша: «Пішу я да цябе, нашчадак мой, заўсёды знай: вытокі тут твае».

**Старшыня Дамачаўскага сельвыканкама Анатоль СТРУК** адзначае:

— Цяпер мы працуем над тым, каб выдаць асобнай брашурай запісанае і сістэматызаванае нашым дамачаўскім краязнаўцам, гісторыкам Мікалаем Ганчаровым. Поспех нарыса Вольгі Дзмітрыеўны падштурхоўвае гэта рабіць. Бо для справы выхавання маладога пакалення веданне сваёй гісторыі, пашана да мінулага малой радзімы становіцца ўрокам, які цалкам не здольная замяніць тэорыя.

Яшчэ раз упэўніўся, наколькі гэта важна, — працягвае Анатоль Іванавіч, — калі пасля выхаду кнігі сельсавецкія тэлефоны літаральна сталі абрываць з просьбамі нейк набыць асобнік. Але ж мы не маглі дапамагчы, бо наклад атрымаўся вельмі невялікі па прычыне абмежаванасці сродкаў. Калі б знайшоўся спонсар, аддрукавалі б дадатковы тыраж. Кніга, як бачым, патрэбная.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Брэсцкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 27 мая 2021 года.




## НЕ ШУКАЮЧЫ, НЕ ЗНОЙДЗЕШ...

### Яшчэ і новага сябра

Быў час, калі мая знаёмая (назавём яе Тоняй) працавала ў заводскай кацельнай. Зімой там, вядома ж, складана было, бо працавала ўсё абсталяванне, а восень летам яны часцяком дзяжурылі па адным. І тады, каб весялей было, каб час хутчэй пралятаў, Тоня даставала пруткі і з рознакаляровых нітак вязала сабе жакет. І няшмат ужо заставалася — адно рукаво...

Факт, што, чарговы раз ідучы на работу, жанчына несла з сабой вялікаватую сумку. На дне яе ляжала пачатае рукаво, невялікі пакунак з ежай, зверху — асобны пакет з маточкам патрэбных нітак.

Разлажыць гэта ўсё Антаніна не паспела: пакінуўшы сумку на стале, яна пайшла на дзяжурны агляд, а калі вярнулася, аж аслупянела. Каля сумкі, відаць, знюхаўшы катлету, стаяў вялізны кацяра і трымаў у зубах... мяшэчак з матком.

Нейкі час яны моўчкі глядзелі адно на аднаго. Тоня думала, як адабраць свае ніткі, кот — як скрасці здабычу...

Зрэшты, з гэтым праблем не было, бо на шчытавой зазваніў тэлефон (начальства!) — Тоня паспяшалася адказаць, а кот (жанчына чула) цяжка скочыў на падлогу і з пакетам у зубах сігануў за дзверы. «Ну і ўцякай, — услед яму падумала жанчына. — Усё роўна нідзе не дзенешся: дзверы-вокны зачыненыя»...

Яна дарэмна на іх спадзявалася, бо потым, пасля размовы па тэлефоне, абышла ўсе лесвіцы, агледзела, як здавалася, усе куткі паміж катламі, — ні ката, ні патрэбнага матка анідзе не было.

Стаміўшыся (аніколі раней яна столькі не хадзіла), Тоня села за стол і падумала, як добра было б зараз выцягнуць ногі, дастаць пруткі, давязаць рукаво, а дома сшыць жакет...

Шанцы прыбрацца ў яго, падобна, адкладаліся, і надта надоўга: пакуль яшчэ купіш патрэбныя ніткі... Калі яны ёсць дзе ў продажы.

Настрой быў канчаткова сапсаваны. Тоня ледзь дачакалася раніцы, каб яшчэ раз абысці ўсе памяшканні, каб пашукаць прапажу на вуліцы і...

Не, цуды ўсё-ткі здараюцца: на задворках кацельнай яна ўбачыла свае ніткі. Кот, падобна, упэўніўся, што нічога ядомага ў пакеце няма, і пакінуў яго на сцежцы, а сам «нырнуў» у разбітую фортку — вярнуўся ў будынак лавіць мышэй.

Так ці іначай, Тоня рада была знаходцы і на тым месцы стала пакідаць кату нейкія пачастункі. Што здзіўляла, знікалі яны заўсёды, а вось ката Антаніна не бачыла... Хіба нейк знайшла дохлую мыш, якую той пакінуў у знак удзячнасці.

**Тацціяна Чэкед,**

*г. Гомель.*

## ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА, ВУЧЭННЕ ПАМОЖА

Кажуць, старога вучыць, што мёртвага лячыць — безнадзейная справа, але ж бярэцца за яе амаль кожны. Нехта з меншым поспехам, нехта з большым...

Сцёпка працаваў у калгасе механізатарам, жонка яго — даяркай. І не толькі на ферме: дома таксама была карова, а то і дзве, пара-тройка свіней, куры, гусі... Хапала працы, бо муж з дому сыходзіў рана, вяртаўся позна, зрэдку хіба забягаў на абед. Але ж і зарабляў... Асабліва на пасяўной, на ўборачнай... Прыемна было распісацца ў ведамасці.

Вось і ў той дзень Сцёпа завітаў у праўленне, атрымаў зарплату — і сваю, і жончыну — паклаў у кішэню, парадаваўся, што добрая капейка. «У абед, — падумаў, — трэба схадзіць дахаты, аддаць гаспадыні».

І, вядома ж, прыйшоў, а той, як на ліха, дома няма: збегла кудысьці. І не, каб дзверы за сабой замкнуць — венікам падперла і панеслася. А тут — хто хочаш хадзі, што можаш вынось...

Сцяпан даўно ўжо нервы парваў, пра гэта гаворачы! Ды ўсё ўпустую: не адумалася жонка нават пасля таго, як у суседняй вёсцы хаты «пачысцілі»...

«Ну я ж цябе правучу!» — падумаў муж: збольшага падсілкаваўся, адчыніў шафу, параскідаў па хаце зложанае там багацце, на стале (тэлефонаў, вядома ж, не было) пакінуў сваёй запіску, што зарплату атрымаў і палажыў пад дыванок, што сёння прыйдзе пазней... Дзверы па прыкладзе жонкі падпёр тым самым венікам і рушыў да трактара.

Колькі там часу прайшло, дамоў вярнулася Наста і ледзь не самлела: «Каравул! Абакралі!..»

Гэта была першая рэакцыя, другая — «Што ж канкрэтна панеслі?» Давай яна глядзець, перабіраць свае хованкі, давай складаць ды вешаць у шафу параскіданыя рэчы, давай урэшце падымаць дываны і дыванкі (нават на сценах) у пошуках зарплаты.

Яе, апошняй і чакана вялікай, анідзе не было!

Расстроеная, заплаканая жанчына пашыбавала на ферму, праўда, дзверы ўжо замкнула — ключ палажыла ў схованку над вушаком, вядомую толькі сваім.

...Сярод іх, гэтых сваіх, была і Сцёпкава маці. Праходзячы міма, яна ўбачыла вялікі замок і здзівілася (дзеці карысталіся ім, хіба едучы ў госці альбо на базар). Глянула пад дыванок, ці няма ключа, убачыла пачак грошай. «Звар'яцелі, з глузду паз'язджалі!.. Прычым абое!» — падумала яна пра сына з нявесткай, забрала грошы і пайшла да сябе дамоў.

А бліжэй да вечара Сцёпку сустрэла жонка.

— Прабач, даражэнькі! — стала прасіцца ў мужа. — Гэта ж я пад абед на пяць мінут выскачыла да суседкі, а нехта ў гэты час прачытаў тваю пісаніну і грошы забраў... Хай бы ж ты іх з сабой панасіў, хай бы пазней аддаў... А так... Прапалі. Ды ты сам іх злодзею ў кішэнь палажыў: запіску на стале пакінуў!

Сцёпка слухаў і маўчаў — чакаў, пакуль жонка наплачацца, каб потым нарэшце супакоіць яе лагодным:

— Ну хопіць... Ну кінь... Нідзе не дзеліся нашы грошы. Пачакай — зараз прынясу.

Рушыў на ганак, сагнуўся, падняў дыванок, а несці... няма чаго.

— Дурань, бязмен стары! — закрычала на Сцёпку жонка. — Мяне за венік поедам ясі, а сам што — лепшы? Знайшоў куды грошы пакласці...

На разборкі (а яны ў гэтай хаце рэдка здараліся) прыбегла свякроў: насварылася на нявестку, надавала кухталёў сваайму ёлупню-сыну і вярнула грошы.

З той пары як адрэзала: Наста больш ніколі не падпірала дзверы венікам, Сцёпка не клаў зарплату пад дыванок, свекрыві, адпаведна, не было чаго забіраць. Добра ўсё, што добра канчаецца, калі вучаць свае...

І сваіх.

**Мікалай Багданаў,**

*в. Новы Пагост, Мёрскі раён.*

## ЛАСЫ... НА ЧУЖЫЯ КАЎБАСЫ

Для пачатку трохі лінгвістыкі: калі недзе Вялікдзень, то ў нас Вялiканне (націск на і), калі недзе валачобнікі, то ў нас алалоўнікі (вытворнае, відаць, ад «алілуя...»). Трэцяе мясцовае слова патлумачыць складаней... Мо чытач здагадаецца сам?

Пасля вайны прайшло тады гадоў з дзесяць. Спаленыя прылесныя вёсачкі неяк з горам папалам адбудаваліся, аднак людзі ў іх жылі вельмі бедна. Да таго ж досыць строга трымалі саракадзённы пост, калі і гэтае нельга, і тое не еш, бо прыйдзецца сядзець пад карытам...

Факт, што згаладалыя маладыя мужчыны і хлопцы як манны нябеснай чакалі велікоднай ночы, каб пайсці па хатах, каб разжыцца нечым з выпіўкі ды закускі.

Найчасцей гэтым «хадакам» давалі сырыя ці вараныя ў шалупінні яйкі. Але ж больш заможныя маглі ахвяраваць і колца так званай пальцам пханай кілбасы, і кавалачак сала, і паўлітэрак гарэлкі... Нічога не даць лічылася ганьбай.

У той раз у гурт алалоўнікаў уваходзіла пяцёра хлопцаў і нават гарманіст. Словы велікодных песень яны трохі ведалі, гралі і спявалі, мякка кажучы, так сабе, аднак штонішто з харчоў у кош ім трапляла. А насіў яго Юзік, хлопец з вельмі беднай сям'і. З раніцы ён амаль нічога не еў і таму па дарозе ад адной вёскі да другой не ўтрымаўся: праглынуў кольца кілбасы, праглынуў у цемры, крадком, на хаду, магчыма, амаль не жуючы...

Не дзіва, што яна, свежавэнджаная, з жывым яшчэ водарам ядлоўца, колам стала ў галодных вантробах і прычыніла гэтакі боль, што хлопец скруціўся ў абаранак і нема завыў...

Сябры з яго спачатку парагаталі, але ж убачылі, што справы дрэнь і, падхапіўшы пад пахі, ледзь не волакам пацягнулі ў родную вёску.

Хату яго там, праўда, абмінулі, — прывалаклі да цётачкі Мані. Хата яе была нечым накшталт медпункта, бо сам ён (ды і тэлефон...) быў за добры дзясятак вёрст. А тая цётка загаворанай вадой ды разумным словам і вялікіх, і малых лячыла ад сурокаў ды перапуду, ведала толк у травах.

Карацей, пабудзілі яе алалоўнікі (прычым не песнямі), расказалі пра Юзікаву хваробу. Цётка з хвіліну паглядзела-падумала ды прынесла бутэлечку нейкай вадкасці — загадала небараку выпіць, калі хоча жыць...

Паміраць хлапцу, вядома ж, не хацелася, таму ён паслухаўся, каб потым...

Ледзь дабег, бядак, да вядомай «шпакоўні»...

Назаўтра (ведама, вёска і свята) пра гэту прыгоду гаманілі многія. «Малайчына, — казалі пра Юзіка. — Апраўдаў «пасаду».

А назва яе (сінонім дыярэі) пайшла, відаць, ад таго, што ў хлопца з кашом былі такія ж папярэднікі — ласыя на чужыя каўбасы — галодныя альбо хітрыя.

**Іван Сіманёнак,**

*г. Паставы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## Неасабісты суб'ектыў



# ЦЯЖКАСЦІ ВЫХАВАННЯ

**Ці варта шкадаваць умоўную Марыю Іванаўну, якая замахнулася на ўмоўнага хулігана Пецю?**

«ВЫПУСКНЫ» ў дзіцячым садку ўдаўся. Дзяўчынкі былі ў бальных сукенках, бы маленькія прынцэсы, хлопчыкі — ледзь не ў смокінгах. Яны кранальна спявалі, танчылі, дэкламавалі вершы, адпускалі ў неба паветраныя шарыкі. Нешматлікія з-за пандэміі гледачы (у асноўным матулі ці бабулі) употай выцiралі слёзы замілавання. Яно сапраўды было з чаго цешыцца: праграма зроблена, як сапраўдны амаль двухгадзінны спектакль — з прадуманымі нумарамі, удалым музычным суправаджэннем, падрыхтаванымі маленькімі артыстамі. Відаць было, што на рэпетыцыі пайшло шмат часу і сіл. Нават падчас выступлення дзеці ўвесь час паглядвалі на музычнага кіраўніка, а тая на іх мове жэстаў падказвала, накіроўвала. І ўсё ішло зладжана, і нават у даволі складаных танцах малыя рухаліся надзіва сінхронна... Фінальным акордам свята было ўручэнне кветак выхавальнікам і ўсім, хто на працягу трох гадоў у працоўныя дні займаўся з дзецьмі больш, чым іх бацькі. Без кветак засталася толькі... музычны кіраўнік, якая рыхтавала развітальны фэст. Бо правінілася, і такім чынам бацькі замест падзякі выказалі сваё «фэ».

У чым правінілася? Нягледзячы на ўсе «выпускнога», падчас чарговай рэпетыцыі, яна спрабавала супакоіць аднаго няўрымслівага хлапчука. Магчыма, хацела злёгку стукнуць яго па патыліцы. Але трапіла па твары дзяўчынцы, што стаяла побач, — падрапала пазногцямі шчаку... Карацей, далей можна не працягваць. Тыя, хто мае сёння дачыненне да ўстаноў адукацыі, — і бацькі, і педагогі — ужо ўявілі, што было далей. Жанчыне яшчэ пашанцавала, што бацькі дзяўчынкі не звярнуліся ў міліцыю. Магчыма, толькі таму, што пабаяліся сапсаваць дзецям свята, да якога заставаліся лічаныя дні. Але ж назаўтра ў садку былі разборкі з удзелам бацькоў і загадчыцы. Супакоіць абураных дарослых удалося толькі абяцаннем, што адразу пасля «выпускнога» музработнік звольніцца. А дзеці... Дзеці хутчэй запомняць свой прыгожы ўрачысты «баль» (які ў дарослых, дзякуй богу, хапіла розуму не псаваць скандалам), а не тое, як умоўная Марыя Іванаўна замахнулася на ўмоўнага хулігана Пецю, бо ён не слухаўся...

ВОСЬ прызнайцеся шчыра: вам гэту самую ўмоўную Марыю Іванаўну крыху шкада? А мне шкада. Пры ўсім тым, што разумею: так рабіць было нельга, педагог павінен мець вытрымку, умець разрульваць любыя сітуацыі словам і пераконаннем. Але, паколькі вырасла ў сям'і настаўніцы і маю настаўнікаў сярод блізкіх сваякоў, я сёння ўсё ж стану на бок педагогаў. Не ў плане апраўдання, а ў плане павагі да іх працы. Вось з гэтым у сучасным грамадстве праблемы. Якія цягнуць за сабой праблемы іншыя — аж да рукапрыкладства з боку настаўнікаў. Якія таксама людзі і якія проста не вытрымліваюць.

Я незнарок у пачатку нават не намякнула, дзе менавіта адбывалася гэта «выпускная» гісторыя, пра якую ведаю з першых вуснаў. Бо гэта ж якая навіна для сецiва — «У горадзе (ці вёсцы) N выхавальніца ў дзіцячым садку падрапала дзіцяці твар». Пасля — каментарыі ад «канапных крытыкаў», большасць з якіх — з праклёнамі і пажаданнямі выхавальніцы не жыць. Я перабольшваю? А згадайце гісторыю мінскага дырэктара школы, які пасмеў узяць за вуха вісуса, што публічна і знарок здзекаваўся з прыбіральшчыцы. Ці гомельскую настаўніцу, якая на эмоцыях замахвалася партай на вучня, які не слухаўся і смяяўся ёй у вочы. (Яе, калі памятаеце, аднавілі на працы рашэннем Прэзідэнта, але колькі бруду было на педагога з амаль трыццацігадовым стажам выліта!)

МАГЧЫМА, тут трэба гаварыць пра канфлікт пакаленняў, бо, абмяркоўваючы гэтую тэму з калегамі, заўважыла, што старэйшыя — узросту 40+, адносяцца да пытання, скажам так, лягчэй. З настальгічнай усмешкай успамінаюць, як за непаслухмянства настаўнік мог пацягнуць за вуха ці злёгку стукнуць па патыліцы, і не бачаць у тым нічога страшнага. Яшчэ прыгадваюць, што была, так бы мовіць, градацыя дазволенага: адна справа — злёгку тузануць за вуха і зусім іншая — ударыць. Так, і раней настаўніка маглі звольніць або нават пасадзіць (быў у суседняй з нашай школе і такі выпадак), але ж для гэтага трэба было так распусціць рукі... А яшчэ мы гаварылі пра тое, што настаўнікаў паважалі і нават крыху пабойваліся. І дзеці, і бацькі. І гэта было правільна.

Людзі маладзейшыя (чытай — сённяшнія маладыя бацькі дзетсадаўцаў і малодшакласнікаў) да падобных развагаў маюць схільныя ані. Яны катэгарычныя: маё дзіця — цэнтр Сусвету і дакранацца да яго магу толькі я! Калі ж пачынаеш гаварыць пра павагу да настаўніка, у адказ чуеш штосьці паблажлівае накшталт «а гэта яго работа!». А сёння, калі педагогі разам з сілавікамі аказаліся пад сапраўдным ціскам, да іх некаторыя маладзёны ставяцца ўвогуле з пагардай. Якая не мае пад сабой ніякіх асабістых падстаў, проста паводле прафесійнай прыналежнасці і таму, што ў пэўным асяроддзі так сёння модна. І што, дзеці — самыя назіральныя ў свеце істоты, гэтага не бачаць? Нават калі бацькі неверагодна правільныя і не выказваюць свае думкі пры іх (а гэта з'ява нячастая). І з чым пойдзе гэтае «недатыкальнае» дзіця ў садок ці ў школу? Як будзе ставіцца да выхавальніка ці настаўніка, які для яго, дзякуючы бацькам, ад пачатку не аўтарытэт, як будзе сябе паводзіць, ці будзе слухацца? І ці хопіць сіл, цярпення, здароўя ўсім настаўнікам не толькі справіцца з гэтым, але ж яшчэ і навучыць? Бо вучыць — гэта ж і праўда іх непасрэдная работа.

ЯКУЮ, дарэчы, ніякія найноўшыя тэхналогіі і робаты не заменяць. Дык, можа, давайце не забывацца, што тыя, хто вучыць і выхоўвае нашых дзяцей, — найперш жывыя людзі?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Радзімазнаўства. Адрасы пісьменства

# ТАМ, ДЗЕ

# Мастак, ілюстратар, выкладчык

## У галерэі Васіля Шаранговіча



У мастацкай галерэі твораў народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча.

**У Нарацкім пасялковым цэнтры культуры і адпачынку працуе галерэя народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча. Ён нарадзіўся ў вёсцы Качаны Мядзельскага раёна. Прайшоў вялікі працоўны шлях як мастак, ілюстратар кніг, выкладчык, кіраўнік. У 1972—1989 гадах — загадчык кафедры графікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, у 1989—1997 — рэктар гэтай навучальнай установы (з 1992-га Беларуская акадэмія мастацтваў), з 1997-га — дырэктар Музея сучаснага выяўленчага мастацтва.**

— Галерэя такога ўзроўню для нашага пасёлка, мясцовасці — вялікая ўдача і падзея, — лічыць **малодшы навуковы супрацоўнік Наталля СМЯТАНІНА.** — З прапановай яе стварэння выступіў сам Васіль Пятровіч, які перадаў 130 сваіх твораў жывапісу і графікі. Яго прапанова супала з тым, што ў курортным пасёлку Нарач была пабудавана новая школа. Будынак старой установы адукацыі, дзе цяпер знаходзіцца галерэя, вызваліўся. На плошчы чатырох класаў у 200 квадратных метраў і была арганізавана галерэя. Яна паспяхова працуе ўжо тры гады.

У мастака вельмі шырокі спектр выяўленчых твораў. Практычна ўсе залы галерэі — гэта яго ілюстрацыі да мастацкіх, дакументальных, гістарычных і іншых твораў. Адна з залаў прысвечана раману Адама Міцкевіча ў вершах «Пан Тадэвуш». За свой доўгі творчы шлях Васіль Шаранговіч праілюстраваў больш як 60 выданняў. Сярод іх — зборнік вершаў Якуба Коласа «З майго летапісу», кнігі «10 дзён, якія патрэслі свет» Дзіна Рыда, «Новая зямля» Якуба Коласа, «Салавей» Змітрака Бядулі, творы Максіма Багдановіча, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Івана Навуменкі і іншых.

За ілюстрацыі мастак атрымаў 15 усесаюзных і 20 рэспубліканскіх дыпломаў, сярод якіх чатыры дыпломы і медалі імя Ф. Скарыны. У галерэі прадстаўлены ілюстрацыі да твораў беларускай і замежнай літаратуры, а таксама акварэлі з вясковымі краявідамі. Як правіла, мядзельскімі. Асабліва ўдаваліся мастаку вобразы сялян. Гэта каларытныя тыпажы, якія прадыктаваны асаблівасцямі беларускай прыроды — мяккай, спакойнай. Як і самі беларусы.

У галерэі не толькі карціны аб родных прасторах, краі, але яшчэ і цудоўныя нацюрморты з раслін, напрыклад, «Півоні». Мы бачым прыгожы букет, увесь цыкл жыцця і згасання кветак, якія паступова пачынаюць ападаць, пераходзяць у іншую стадыю. Можна сказаць, што карціна мае высокі філасофскі ўзровень, таму што яе можна параўнаць з хуткаплынным жыццём чалавека. Словам, імгненне паміж мінулым і будучыняй. А вось карціна «Дзьмухаўцы». Гэта кветка нашага дзяцінства, малое сонейка, якое бачым у траве, калі робім першыя крокі па роднай зямлі.

— Калі мы падыходзім з наведвальнікамі да гэтай карціны, я расказваю прыгожую казку. І, мабыць, не было яшчэ чалавека, які б застаўся раўнадушным да яе, а многія нават выціраюць слёзы, — кажа Наталля Міхайлаўна. — Сюжэт яе просты. Жыў-быў маладзенькі ветрык, які лятаў, дзе хацеў, па ўсім белым свеце. У яго было шмат уражанняў ад падарожжаў. Аднойчы, пралятаючы над садам, ён убачыў у траве маленькую жоўтую кветку. Захацеў пасябраваць з ёй. Ветрык стаў расказваць новаму сябру, дзе ён быў, што бачыў. У адказ дзьмухавец уздыхнуў: «Я так бы хацеў палятаць з табой, але мяне трымае зямля, я не магу ад яе адарвацца». Ветрык паляцеў па сваіх справах. Ішоў час, і ўсе расліны, кусты казалі дзьмухаўцу, што ён мяняецца на вачах. Але той не мог паглядзець на сябе: не было люстэрка. Аднойчы ветрык вярнуўся і не мог знайсці свайго сябра. І раптам пачуўся знаёмы тоненькі галасок, але перад ім была іншая істота. «Птушкі, якія праляталі, сказалі, што я змагу палятаць, калі ты вернешся», — загаварыў дзьмухавец. «Давай палятаем», — сказаў ветрык і падзьмуў на дзьмухаўца. Дзясяткі парашуцікаў падняліся ў паветра і голасам дзьмухаўца, таго жоўценькага сябра, крыкнулі: «Я лячу, я лячу!».

Гэтая казка вельмі простая, але мае глыбокі сэнс. Вось гэтак жа ў кругазвароце дзён, нявырашаных праблем, гора, смутку мы не можам падняцца да сваёй мары. Апускаем галаву, глядзім у зямлю. А трэба імкнуцца, каб за нашай спінай былі такія ж крылы-парашуцікі, як у дзьмухаўца. Тады кожны зможа дасягнуць мэты.



«Паланез» — адна з серыі ілюстрацый, якую Васіль Шаранговіч стварыў да паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэуш».

Калі гаварыць у цэлым аб галерэі, то гэта магутны цэнтр выхавання, як дзяцей, так і дарослых. Усе работы аўтара прасякнуты любоўю да роднай зямлі. І, канешне, знаходжанне галерэі ў Цэнтры культуры дае магчымасць шукаць новыя формы работы. Напрыклад, тут ладзіцца экскурсія-канцэрт, падчас якой выконваецца дзесяць музычных твораў, якія нібыта раствараюць карціны, іх тэму ў сабе. І ў той жа час аказваюць духоўнае і эмацыянальнае ўздзеянне.

— Гэтыя канцэрты вельмі папулярныя, і мы з задавальненнем іх паўтараем. Імкнёмся данесці ідэю, якую закранае Васіль Шаранговіч у сваіх карцінах, — падсумавала Наталля Смятаніна. — Мы пашыраем нашу дзейнасць. Акрамя мастацкіх твораў Васіля Пятровіча, экспануем невялікія экспрэс-выстаўкі.

Напрыклад, некалькі месяцаў працавала экспазіцыя жыхара пасёлка Леаніда Апанасевіча. Леанід Іванавіч — педагог, 40 гадоў адпрацаваў у аздараўленчым дзіцячым летніку «Зубраня». Выстаўку па вясенніх матывах, пейзажах ён прысвяціў сваёй жонцы, якая, на жаль, пайшла з жыцця. Ён вельмі перажываў смерць блізкага чалавека. І, магчыма, толькі работа, напісанне карцін дапамаглі яму прыглушыць боль.

Цяпер у памяшканні экспануюцца калекцыі малых скульптур каслінскага ліцця другой паловы XIX стагоддзя, мастацкай керамікі Віктара Майсяёнка. «Няхай паглядзяць людзі — радасцю трэба дзяліцца», — лічыць ён.

— Наперадзе — летні перыяд, адкрываецца курортны сезон. І хочацца нашым гасцям паказаць, якія ў нас таленавітыя людзі, іх творчасць, — кажа **дырэктар Нарацкага цэнтра культуры і адпачынку Таццяна ГРЭЛІК.** — Акрамя таго, у нашым раёне знаходзяцца тры лецішчы знакамітых пісьменнікаў — Максіма Танка, Аркадзя Куляшова і Міхася Лынькова. Праўнучка Аркадзя Куляшова Алеся Іса скончыла Беларускую акадэмію мастацтваў. У галерэі прадстаўлена невялікая выстаўка яе работ. Яна добра ведае і паважае Васіля Пятровіча Шаранговіча, які быў яе педагогам. І мы дэманструем сувязь пакаленняў мастакоў.

# САЛЁНЫ ВЕЦЕР

**«Арт-гасцёўня, або Сустрэча са знакамітымі людзьмі» — так называецца праект, які рэалізоўваюць Нарацкая пасялковая бібліятэка, Цэнтр культуры і адпачынку і галерэя Шаранговіча. Да 22 чэрвеня — гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны — рыхтуецца праграма з Алегам Сала.**



Алег Іванавіч працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм» з 1987 да 2016 года. «Спачатку ў штаце, затым, калі выйшаў на пенсію, то па дагаворах падраду, — кажа ён. — На «Беларусьфільме» я быў намеснікам дырэктара, дырэктарам многіх кінакарцін, кіраўніком групы фестывальных праграм, Дзён кіно, культуры. Мне пашанцавала, што працаваў са знакамітымі кінарэжысёрамі Віктарам Дашуком, Міхаілам Пташуком, Дзмітрыем Астраханам, Анатолем Алаем, з расіянамі, французамі, немцамі, як у дакументальным кіно, так і ў ігравым. Былі ў розных кінастужках у мяне і эпізадычныя ролі».

Алег Сала ўдзельнічаў у здымках фільма на Нарачы «Салёны вецер». Ён пастаўлены на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1988 годзе рэжысёрам Алегам Смірновым. Гэта сёмы фільм тэлевізійнага серыяла «Дзяржаўная граніца». Вядома ж, дзецям цікава будзе паслухаць, як здымаўся гэты фільм, з якімі цяжкасцямі сутыкаліся яго ўдзельнікі, як ішлі камбінаваныя здымкі.

— Алег Іванавіч аказаў нам дапамогу ў тэатралізаванай пастаноўцы, якую мы ладзілі да 9 Мая, даў прафесійную кансультацыю. Так і пазнаёміліся. Нам цікавае такое супрацоўніцтва, і дзецям таксама, таму што многія фільмы з яго ўдзелам яны глядзелі, — кажа **дырэктар Нарацкага цэнтра культуры і адпачынку Таццяна ГРЭЛІК.**

Да сустрэч са знакамітымі людзьмі ідзе карпатлівая падрыхтоўка. Спачатку вядзецца гутарка, затым пішацца сцэнарый, які ўзгадняецца з госцем. У раённай газеце друкуецца з ім інтэрв'ю. Выступленне гасцей суправаджаецца наглядным матэрыялам — кінасюжэтамі, дакументамі, фотаальбомамі.

У гасцях ужо пабывалі вядомыя паэты, урачы, мастакі. Напрыклад, праўнучка Аркадзя Куляшова — мастачка Алеся Іса.

# «Скарбніца»

Мядзельская зямля багатая

## Званне «Народны» абавязвае

Народны ансамбль народнай песні «Скарбніца» Мядзельскага раённага цэнтра культуры добра вядомы не толькі жыхарам горада і раёна. Калектыў выступаў на канцэртных пляцоўках у Глыбокім, Паставах, Мар'інай Горцы на абласным фестывалі народнай творчасці «Напеў зямлі маёй», у Мінску, прымаў удзел у рэспубліканскім фестывалі харавога мастацтва «Пеўчае поле».

— Гэты калектыў стварыла мая сяброўка Галіна Савіцкая ў 1991 годзе. Мы з ёй вучыліся ў школе з першага класа, затым скончылі Маладзечанскае музычнае вучылішча. Пасля яе смерці, як яе блізкі чалавек, я ўзяла кіраўніцтва ансамблем на сябе. У 2003-м калектыў атрымаў званне «Народны» і пацвярджае яго кожныя два гады, — расказвае **кіраўнік «Скарбніцы» Тамара БЛІЗНЮК.** — У нашым рэпертуары ў асноўным беларускія, рускія народныя песні ў апрацоўцы, акапэльныя без музычнага суправаджэння, творы айчынных аўтараў.

Удзельніцы ансамбля выконваюць шмат прыгожых песень — вясёлых, меладычных, лірычных. Іх заўсёды прымаюць на «біс». Але, бадай, самая любімая ў гледачоў песня «Бульбачка», якую яны падпяваюць усёй залай. А на «Пеўчым полі» калектыў прадставіў песню «Марыся» і акапэльную «Каля майго церама» пад цымбалы.

**Дырэктар Мядзельскага раённага цэнтра куль-**

# ПЛЕШЧАЦЦА НАРАЧ




На гэтых стэндах музея размешчаны фотаздымкі, дакументы, кнігі, уласныя рэчы землякоў-літаратараў.

## Сцежкамі жыцця Паўліны Мядзёлкі

**На вуліцы Зялёнай, 10 у аграгарадку Будслаў, што на Мядзельшчыне, стаіць пафарбаваны ў зялёны колер дом. Тут 12 верасня 1893 года ў сям'і Вінцэнта і Францішкі Мядзёлкаў нарадзілася дачка, якой далі незвычайнае імя Паўліна. Хто ж ведаў тады, што гэтае дзіця Богам адоранае шматлікімі талентамі: педагога, літаратара, актрысы.**

Непадалёку ад хаты, на мяжы агарода, зеляне разгалісты дуб, які пасадзіла Паўліна Мядзёлка. Маленькае дрэўца яна прынесла з урочышча Падбабы. Урочышча знаходзіцца за восем кіламетраў ад Будслава. Але Паўліна любіла там гуляць. Пакуль дрэўца прынялося, то дзеці два разы ламалі вяршок. Пазней волата наогул хацелі спілаваць, але Соф'я Грышкевіч, жонка стрыечнага брата Паўліны — Часлава, не дазволіла. Захаваўся і палісаднік, дзе пісьменніца любіла бавіць час з гасцямі. А гасцей-аднадумцаў, дзеячаў культуры і мастацтва — у доме перабывала шмат. Бываў тут і Уладзімір Караткевіч. Калі ён трапляўся на вочы Паўліны нецвярозы, то станавіўся на калені і прасіў прабачэння: «Даруй, мамачка Паўлінка».

— З Паўлінай Вінцэнтаўнай сябравала Галіна Бальчэўская, актрыса Купалаўскага тэатра. Яна родам з суседняй вёскі Паляссе. Па чутках, ёй сімпатызаваў Уладзімір Караткевіч. На кніжцы, якую ён падараваў, пакінуў надпіс: «Галінцы-вярбінцы з беларускага Палесся». Апошні раз Галіна Бальчэўская паказала ў Будславе свой монаспектакль, прысвечаны трагічнаму лёсу жанчыны з чарнобыльскай зоны, усе плакалі. У хуткім часе яе не стала, — расказалі ў Будслаўскай беларускамоўнай сярэдняй школе, якая носіць імя Паўліны Мядзёлкі.

Гэта адна з найстарэйшых навучальных устаноў Беларусі, заснавана ў 1794 годзе. Тут з 1947 да 1958 года працавала Паўліна Мядзёлка, якой у 1966-м прысвоілі званне заслужанага дзеяча культуры БССР.

У школе свята берагуць памяць аб знакамітай зямлячцы. Тут Паўліна Вінцэнтаўна стварыла хор. Калектыў выступаў у Мінску, Маладзечне, навакольных населеных пунктах — Княгінін, Крывічы, Докшыцы, Даўгінава ды іншых. І заўсёды самадзейныя артысты вярталіся з узнагародамі. Пасля выхаду на пенсію Паўліна Мядзёлка чытала лекцыі, з тагачаснай будслаўскай моладдзю ставіла спектаклі па творах беларускіх класікаў, у тым ліку і неўміручую «Паўлінку». Жыццю і творчасці знакамітай землячкі прысвечана адна з экспазіцый у школьным музеі. Тут захоўваюцца касцюм, паліто, туфлі, боцікі, гітара, будзільнік, фота розных гадоў, што належалі Паўліне Мядзёлцы, а таксама яе попельніца. Як згадваюць у Будславе, яна шмат курыла. І бадай, самае каштоўнае — адзіны экзэмпляр мемуараў «Сцежкамі жыцця», якія выйшлі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1974 годзе, пасля смерці Мядзёлкі.



— Паўліна Вінцэнтаўна шмат працавала на ніве нацыянальнага адраджэння. Наша школа беларускамоўная, мы ганарымся, што тут выкладала Паўліна Мядзёлка, якая прывівала дзецям любоў да беларушчыны, — кажуць вучні і педагогі.

Паўліна Мядзёлка прыехала на сваю малую радзіму ў 1947 годзе, каб даглядаць нямоглую маці. Яе брат Часлаў з жонкай Соф'яй жылі ў сваёй хаце. Пераехалі сюды ў 1957-м па просьбе Паўліны: ёй цяжка было спраўляцца адной з хатнімі справамі, хворую маці трэба было не адзін раз за дзень перавярнуць у ложку. Яны жылі ў адной палове хаты, у другой стаялі козы. Брат Чэсь адбудаваў другую частку і тут пасяліўся з сям'ёй.

У доме захавалася піяніна, на якім любіла іграць Паўліна Мядзёлка, канапа, газавая лямпа, пры якой працавала начамі, вучыла сваіх пляменнікаў Казіка і Стася гуляць у шахматы, чытала ім кніжкі.

Паўліна Мядзёлка з маленства імкнулася да ведаў, рана навучылася чытаць. Пасля заканчэння царкоўна-прыходскай школы ў Глыбокім хацела працягваць вучобу. Маці і бацька былі супраць. Але яны разумелі, што дачка зусім не здольная да вясковай працы, і адпусцілі да сваякоў у Рыгу, дзе яна скончыла прыватныя курсы. Затым паступіла ў жаночую гімназію ў Вільні. У 1908 годзе Паўліна Мядзёлка пазнаёмілася з вершамі Янкі Купалы на старонках газеты «Наша ніва», а ўпершыню сустрэлася з ім у доме сваіх знаёмых.

У сваіх мемуарах «Сцежкамі жыцця» яна піша, што крыху расчаравалася ў Купале. Яна яго ўяўляла волатам, асобай. А тут яна ўбачыла звычайнага франтаватага хлопца. Праз некалькі месяцаў яны сустрэліся ў кавярні «Зялёны штраль», дзе збіралася беларуская інтэлігенцыя. Купала прапанаваў Паўліне злучыць іх лёсы. Ды яна адмовіла.

Купала ажаніўся з Уладзіславай у 1917 годзе, а Паўліна выйшла замуж за заснавальніка беларускай партыі эсэраў Грыба крыху пазней. Па версіі даследчыкаў, іх шляхі разышліся таму, што ён з'ехаў працаваць у Прагу, а яна — у Берлін. У сваіх мемуарах Паўліна згадвала, што бывала ў доме Купалы. Але адносіны паміж ёй і жонкай паэта вельмі загадкавыя, як і каханне паміж творцам і самой Мядзёлкай. Хутчэй за ўсё Купала і спісаў вобраз Паўлінкі ў аднайменнай п'есе з Мядзёлкі, дзе яна і выканала галоўную ролю. Гераіня атрымалася такой жа гарэзлівай і адначасова шляхетнай. Паэт прысвяціў Мядзёлцы і іншыя творы. У прыватнасці, вершы «Ён і яна», «Гэткім шчырым каханнем яе атуліў», «А яна была проста дзяўчынай...», «Снілася дзяўчыне», «Быў гэта сон...», паэмы «Бандароўна», «Яна і я».

Апошнім часам Паўліна Вінцэнтаўна моцна хварэла. Памерла яна 13 лютага 1974 года і пахавана на Будслаўскіх могілках побач са сваімі бацькамі — Вінцэнтам і Францішкай. На яе магіле ўсталяваны вялікі гранітны помнік. Паўліна Мядзёлка не дачакалася выхаду сваіх мемуараў «Сцежкамі жыцця». Адчувала, што ёй засталося жыць нядоўга, таму склала спіс сяброў, прыязных да яе людзей, каму неабходна адправіць гэтую кнігу.

Выйшлі мемуары пасля яе смерці. І Соф'я Грышкевіч выканала апошнюю просьбу сваячкі.

## Са знакамітымі гасцямі на лецішчы

**Значнае месца ў экспазіцыі Мядзельскага музея народнай славы адведзена народнаму паэту Беларусі, Герою Сацыялістычнай Працы, грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу Максіму Танку, які нарадзіўся ў вёсцы Пількаўшчына. Тут прадстаўлены шэраг матэрыялаў, дакументаў, кніг з яго аўтографамі, зборнікі вершаў, рукапісы, чарнавікі з накідамі вершаў, асабістыя рэчы, пасведчанні, даведкі часоў Вялікай Айчыннай вайны, паколькі Максім Танк быў на фронце ваенным карэспандэнтам. Шмат таксама фотаздымкаў. Напрыклад, з бацькамі.**

У Мядзельскім раёне ў Максіма Танка было лецішча, якое захавалася да сённяшняга дня. Сюды любілі прыязджаць знакамітыя госці. На адным са здымкаў паэт з Максімам Лужаніным, Якубам Коласам. Гэта фота датавана 1956 годам, годам смерці беларускага песняра. Цікавасць выклікае рукапіс верша, які Якуб Колас прысвяціў Максіму Танку экспромтам у 1948-м. У экспазіцыі таксама ваенныя фота. На адным Максім Танк стаіць побач з Аркадзем Куляшовым.

На адной з карцін прадстаўлены дом, дзе нарадзіўся паэт у 1912 годзе ў вёсцы Пількаўшчына. Аўтар твора — жыхар аграгарадка Златкі, дырэктар мясцовай школы Барыс Пестун.

У невялікай вітрыне сабраны матэрыялы аб народнай артыстцы Беларусі Марыі Захарэвіч, якая нарадзілася ў вёсцы Навасёлкі. Вёска ўвайшла ў межы Мядзела. На здымках актрыса адлюстравана ў сцэнічных ролях. Марыя Захарэвіч жыве ў Мінску, але часта прыязджае на малую радзіму.

Невялікая экспазіцыя прысвечана Паўліне Мядзёлцы. На здымку 1972 года Мядзёлка з Алай Долгай і Раісай Кашэльнікавай, пазнейшымі выканаўцамі ролі Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Янкі Купалы. На іншай фатаграфіі Паўліна Мядзёлка каля помніка Янку Купалу ў Мінску.

Значнае месца ў экспазіцыі музея адведзена жыццю і творчасці народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча, мядзельскім паэтам Іосіфу Скурко, Мар'яну Дуксу, Мікалаю Шабовічу, Адольфу Варановічу. У 1990 годзе ў школе № 1 Мядзела адкрыты музей гісторыі школы імя Уладзіміра Дубоўкі, які дзейнічае як філіял Мядзельскага музея.

## і «Пеўчае поле»

на таленавітых людзей і фестывалі, якія сталі візіткай



Акампаніятар Віктар НАЗАРАНКА і кіраўнік ансамбля Тамара БЛІЗНЮК.

туры Наталля ІВАНОВА не без гонару распавяла, што ў раёне акрамя «Скарбніцы» маецца яшчэ сем калектываў са званнем «Народны». Гэта народны хор «Крывічы», народны вакальны ансамбль «Натхненне», народны ансамбль народнай песні «Радаўніца», фальклорна-этнаграфічны калектыў «Узлянка», народны клуб майстроў «Крывічы», народны ансамбль эстраднай песні «Правінцыя», народны клуб аматараў песні «Верасень».

### «Пеўчае поле»

Візіткай Мядзельшчыны стаў рэспубліканскі фестываль харавога мастацтва «Пеўчае поле». Ён праводзіцца ў раёне з 1952 года. Калі раней мерапрыемства ладзілася на беразе возера, то з 2007-га змяніла пляцоўку і праходзіць на сцэне летняга амфітэатра Мядзела.

За час свайго існавання фестываль з рэгіянальнага пераўтварыўся спачатку ў абласны, а з 2015-га носіць статус рэспубліканскага. Праводзіцца ён адзін раз на два гады. У 2019 годзе мерапрыемства адбылося 22—23 чэрвеня і сабрала 25 калектываў з розных куткоў не толькі Міншчыны, але і ўсёй краіны.

Матэрыялы падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

г. Клецк

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАГОТОВКИ И (ИЛИ) ЗАКУПКИ ДЛИННОПАЛОГО (УЗКОПАЛОГО) РАКА

8 июля 2021 года

| № лота | Территория, на которой предоставляется право на заготовку и (или) закупку | Предмет аукциона | Условия заготовки и (или) закупки | Цена предмета торгов (аукциона) (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Клецкий район | право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака | - предоставление права на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака сроком на пять лет в объемах менее 10000 кг | 580,00 | 290,00 | 146,88 |

1. Аукцион состоится 8 июля 2021 г. в 11.00 в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского,10.

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Участнику необходимо подать соответствующее заявление в Клецкий райисполком.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; копия свидетельства о государственной регистрации; копия Устава, а также представляются: доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, при подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 307; последний день приема документов – 5 июля 2021 г. до 11.00.

Заключительная регистрация участников 08 июля 2021 г. с 10.00 до 10.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет BY38 AKBB 3641 2074 3071 0650 0000 в ЦБУ № 607 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Клецке, БИК AKBBBY2X, ОКПО 04064631. Получатель – Клецкий райисполком, УНП 600198162.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, право на заготовку (или) закупку предоставляется данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

6. Контактные телефоны в Клецке: (8-01793), 50444, 50786, 68232.

## Извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Лот № 1**. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (строительство начато с принадлежностей к жилому дому, процент готовности хозяйственной постройки (сарая) 31 %: фундамент бетонный, площадь застройки 10 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000002006884 площадью 0,0938 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Чепинская, 64.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **18112,93** (394,11 / 17718,82) бел. руб. **Задаток:** 1811 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 2,18 %

**Лот № 2**. Не завершенный строительством законсервированный жилой дом (капитальное строение с инв. № 200/U-101281), наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (процент готовности основного строения – 36 %: фундамент – бутобетон, стены – блоки газосиликатные, перекрытия – деревянные балки, процент готовности мансарды – 24 %: наружные стены – блоки газосиликатные; площадь застройки – 88 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000002007747, площадью 0,0938 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, 8-я Чепинская, 58.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный законсервированный дом/зем.участок): **36100,58** (18381,76 /17718,82) бел. руб. **Задаток: 3610** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 50,92 %

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 15.06.2021 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 28.05.2021 до 17.30 14.06.2021 в рабочие дни по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с: BY14AKBB36423020002802000000 Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Условия для победителя аукциона либо единственного участника: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта; разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством. Рассрочка внесения платы за земельный участок предоставляется в порядке, установленном законодательством.

Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – размещение объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельных участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

